СВЯТЛО ВЫСОКАЙ ДУХОЎНАСЦІ

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Раством Хрыстовым.

Гэта светлае свята прыносіць надзею і ўмацоўвае веру ў лепшую будучыню. Яно сімвалізуе перамогу сапраўднай духоўнасці і чалавекалюбства, праслаўляе высакародныя ідэалы гуманізму і міласэрнасці.

Для многіх людзей Раство Хрыстова дапамагае далучацца да вечных каштоўнасцей. Яно цудоўным чынам аб'ядноўвае родных і блізкіх у добрых справах выхавання маладога пакалення. Кожны чалавек менавіта ў сям'і спазнае шчаслівае і незабыўнае адчуванне цяпла і клопату, менавіта сям'я вучыць працаваць, ствараць і з упэўненасцю глядзець у будучыню.

Няхай калядныя дні падораць вам святло высокай духоўнасці, прынясуць добры настрой і прыемныя ўспаміны. Няхай сэрцы напаўняюцца жыццёвай сілай. Няхай дастатак і дабрабыт, давер і разуменне паселяцца ў кожным доме.

Жадаю вам моцнага здароўя, аптымізму і поспехаў ва ўсіх пачынаннях.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

6 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 2 (28112) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧАС РАБІЦЬ ДАБРО

ГОДНА ЖЫЦЬ ПАД СТАРАСЦЬ

На працягу трох гадоў павінна быць канчаткова сфарміравана сістэма абароны і падтрымкі пажылых людзей

Такую задачу паставіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання гарадскога дома-інтэрната для ветэранаў вайны і працы «Світанак» у пасёлку Траскоўшчына Мінскага раёна.

Фота БЕЛТА.

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб выкананні яго даручэнняў па развіцці сістэмы сацыяльнага абслугоўвання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Абарона інтарэсаў гэтай катэгорыі насельніцтва з'яўляецца адным з асноўных прыярытэтаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што жыццёвыя сітуацыі ў людзей бываюць розныя, але дзяржава ў любым выпадку павінна абараняць інтарэсы старых і інвалідаў. «Ёсць там старыя, якіх ніхто не глядзіць, незалежна ад наяўнасці дзяцей. Ёсць дзеці, няма дзяцей — іх ніхто не глядзіць. Наша задача — гэтых старых забяспечыць. Бо чалавек павінен правесці сваю старасць як належыць, годна. Трэба, каб старыя жылі ў нармальных умовах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Беларусь разглядае прыпыненне пэўных абмежавальных мер з боку Еўрапейскага саюза і Злучаных Штатаў як прамежкавы крок. Канчатковым крокам павінна быць поўная адмена адпаведных абмежавальных мер, якая, вядома ж, вывела б супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі на зусім новы ўзровень. Але мы спакойна глядзім на тое, што адбываецца, і разумеем, што ў сілу, скажам, такой загружанасці магутнай бюракратычнай машыны ў Бруселі гэтыя працэсы адбываюцца павольна, не так, як хацелася б, але мы маем намер і далей спакойна працаваць з нашымі еўрапейскімі і амерыканскімі партнёрамі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.01.2016 г.

Долар ЗША	18667,00	▲
Еўра	20183,00	▼
Рас. руб.	254,75	▼
Укр. грыўня	785,98	▲

ПАДЗЯКА І ВЕРА

Пасланне да Раства Хрыстовага Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і міранам Беларускай Праваслаўнай Царквы

Што Табе прынясём, Хрысце,
Які з'явіўся на зямлі як чалавек
дзеля нас?
Кожнае з Тваіх стварэнняў падзяку
Табе прыносіць:
ангелы — спеў, нябёсы — зорку,
мудрацы — дары, пастухі — цуд,
зямля — пячору, пустыня — яслі;
мы ж — Маці Дзеву.
Спрадвечны Божа, памілуй нас.

(Сціхіра на «Госпадзі, клічу цябе» вячэрні свята Раства Хрыстовага)

Дарагія і ўзлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, увесь святарскі, дыяканскі і манаскі чын, набожныя міране — верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы! Сардэчна віншую ўсіх вас з вялікім і светлым святам Раства Хрыстовага!

Следам за старажытнымі мудрацамі сёння ўсе мы, прыведзеныя Віфлеемскай зоркай, радасна накіраваліся да ясляў Бажэственнага Дзіцяці — Госпада нашага Ісуса Хрыста: Бог уцялесніўся, каб абнавіць свет, каб людзі «жыццё мелі, і ўдосталь мелі» (Ін. 10: 10). Святы апостал і евангеліст Лука паўтарае словы ангела пра тое, што ў горадзе Давідавым «нарадзіўся вам сёння... Спасіцель, Які ёсць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2: 11). Наколькі ж вялікія невымоўная міласэрнасць і бязмежная любоў Госпада, Які прынізіўся дзеля нашага выратавання! Тварэц неба і зямлі сышоў на зямлю, каб адкрыць Сябе людзям і ўказаць нам шлях у Нябеснае Царства.

Малітвы нашай Святой Царквы на Раство з'яўляюцца працягам таго славаслоўя, якое ў дзівосную ноч Раства ангельскім спевам напоўніла ўвесь свет, высокі і нізкі: «Слава ў вышніх Богу і на зямлі мір, у людзях добрая воля» (Лк. 2: 13-14). У Раство Хрыстовым Усявышні Гасподзь паказаў чалавецтву вялікую тайну Уцялеснення Сына Божага, бо «сёння Бог на зямлю прыйшоў, і чалавек на Нябёсы ўзышоў».

Сёння Гасподзь Уседзяржыцель кладзецца ў яслі нашых сэрцаў, у якіх адбываецца наша ўсынаўленне Самому Тварцу. Успамінаючы, як мудрацы «ўзрадаваліся радасцю вельмі вялікаю. І, увайшоўшы ў дом, яны ўбачылі Дзіця з Марыяю, Маці Яго, і, упаўшы, пакланіліся Яму; і, адкрыўшы скарбніцы свае, прынеслі Яму дары: золата, ладан і смірну» (Мф. 2: 10-11), мы павінны спытаць у сябе: а што ж мы прыносім да ясляў, якія прынялі Неўмяшчальнага Бога?

Яму не патрэбны ні наша слава, ні нашы матэрыяльныя дасягненні; марныя думкі і штодзённыя турботы, імкненні людзей узвысіцца адзін над адным з'яўляюцца пылам у вачах Бога. Ва ўсе часы людзі, якія заганарыліся і аддаліліся ад Бога, у выніку рабіліся нікчэмнымі і нямоглымі.

Няхай жа будзе нашым дарам Бажэственнаму Дзіцяці моцная і шчырая вера, прыклад якой дае нам Прасвятая Багародзіца, бо Яна сказала Архангелу Гаўрыілу, які абвясціў Ёй добрую вестку: «вось, Я — раба Гасподняя; няхай будзе Мне па слову твайму» (Лк. 1: 38). Прападобны Яфрэм Сірын піша, што Дзева Марыя — «Дачка Святла, таму што праз Яе азарыліся Святлом і свет, і жыхары яго». Святая Царква заклікае нас з верай несці свету гэтае Святло, Якое ёсць Гасподзь наш Ісус Хрыстос.

СТАР. 3

НЯМА ТЫХ, ХТО ПРАЙГРАЕ

Хакеістам — перамогі, гледачам — відовішча, а дзецям — дапамога

Неафіцыйны чэмпіянат свету па хакеі сярод аматараў — так нефармальна называюць Калядны турнір на прызы Прэзідэнта. Вядома, тут важныя перамогі, закінутыя шайбы і ачкі. Але па вялікім рахунку і для жыхароў нашай краіны, і для гасцей Беларусі гэтыя спартыўныя спаборніцтвы сталі проста вялікім святам, магчымасцю правесці час у коле сяброў і сям'і, а таксама ўмацаваць прыяцельскія адносіны паміж краінамі-ўдзельніцамі.

Фота БЕЛТА

Першы дзень турніру не толькі скарыў прыгажосцю цырымоніі адкрыцця, але і прынёс першыя сюрпрызы. Шведы нечакана лёгка абгулялі расіян — 8:1, а ў складзе нямецкай дружыны на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» з'явіўся самы ўзроставы ўдзельнік спаборніцтваў. 83-гадовы Эдуард Бшайд ужо больш за дзесяць разоў станавіўся ўдзельнікам Каляднага турніру і сёлета не мае намеру быць статыстам у сваёй камандзе. Напарнікі «дзеда Эдзі» адзначаюць, што Бшайд з'яўляецца ўжо своеасаблівым талісманам іх дружыны і здольны даць фору маладым.

Яшчэ масу цікавых асоб могуць убачыць беларускія заўзятары на адной з найбуйнейшых хакейных арэн краіны. У складзе каманды Славакіі, напрыклад, у Мінск прыехаў уладальнік Кубка Стэнлі (2009 год у складзе клуба «Пітсбург»), чэмпіён свету, «зорка» сусветнага хакея Міраслаў Шатан, у першай жа сустрэчы сваёй дружыны з камандай ААЭ Міраслаў вызначыўся трыма закінутымі шайбамі. Дарэчы, настаўнікам славацкай дружыны з'яўляецца добра вядомы беларускім заўзятарам Юліус Шуплер.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Міністр абароны Польшчы прапанаваў павялічыць колькасць арміі ўдвая

Польшча павінна павялічыць амаль удвая колькасць сваіх узброеных сіл, каб супрацьстаяць ваенным пагрозам. Пра гэта заявіў у інтэрв'ю часопісу Polska Zbrojna міністр абароны краіны Антоній Мацарэвіч. Кіраўнік Мінабароны нагадаў пра існаванне рэзалюцыі Сейма ад 1791 года, якая дазваляе павялічыць колькасць арміі да 100 тысяч чалавек, і адзначыў, што сёння гэты паказчык не перавышае 80 тысяч. «Больш за 200 гадоў у нас няма 100-тысячнай арміі. Думаю, што ў канчатковым выніку колькасць польскага войска павінна складаць 150 тысяч салдат. Гэта той мінімум, які неабходны для процідзеяння ваенным пагрозам», — сказаў міністр. У 2016 годзе, па словах Мацарэвіча, Мінабароны Польшчы плануе стварыць тры новыя брыгады тэрытарыяльнай абароны на ўсходняй мяжы і размясціць там жа існуючыя злучэнні. Галоўнай пагрозай бяспекі ў Еўропе міністр назваў канфлікт на ўсходзе Украіны. Гаворачы аб магчымасці ўдзелу Польшчы ў аперацыі ў Сірыі, міністр адзначыў, што Варшава гатовая аказаць дапамогу Парыжу пры ўмове, што ўлады Францыі падтрымаюць Польшчу ў пытанні размяшчэння на яе тэрыторыі войскаў НАТА.

Дзярждэп не захацеў быць пасярэднікам паміж Саудаўскай Аравіяй і Іранам

Афіцыйны прадстаўнік адміністрацыі прэзідэнта ЗША Джон Эрнэст заявіў, што Белы дом звярнуўся да Саудаўскай Аравіі з занепакоенасцю, што нядаўняе пакаранне смерцю шыіцкага прапаведніка Німра ан-Німра прывядзе да пагаршэння крызісу на Блізкім Усходзе. Эрнэст нагадаў, што ЗША яшчэ да пакарання неаднаразова звярталіся да кіраўніцтва каралеўства з рэкамендацыяй адмовіцца ад задуманага, аднак гэтыя довады так і не былі пачутыя. «Мы настойваем на тым, што спрэчкі паміж Іранам і Саудаўскай Аравіяй неабходна неадкладна вырашыць. Бакі павінны праявіць вытрымку і не дапусціць пагаршэння сітуацыі», — дадаў прадстаўнік адміністрацыі. У той жа час начальнік прэс-службы Дзярждэпартамента Джон Кірбі заявіў, што ЗША не імкнуцца браць на сябе ролю пасярэдніка ва ўрэгуляванні крызісу.

ISSN 1990 - 763X

У табліцу Мендзялеева ўключылі чатыры новыя элементы

Табліца Мендзялеева папоўнілася чатырма элементамі з 113-м, 115-м, 117-м і 118-м атамнымі нумарамі, паведамляе сайт Міжнароднага саюза тэарэтычнай і прыкладной хіміі. Элементам прысвоены часовыя назвы, а пастаянныя з'явяцца ў табліцы праз пяць месяцаў. Асаблівая складанасць у атрыманні новых элементаў заключалася ў тым, што яны распадаюцца на раней невядомыя ізатопы больш лёгкіх элементаў, якія яшчэ трэба будзе вызначыць. Усе чатыры новыя элементы былі сінтэзаваны штучна — у прыродзе не існуе элементаў, цяжэйшых за ўран, гэта значыць, з атамнымі нумарамі (колькасцю пратонаў у ядры атама) больш за 92.

КАРАТКА

Праваслаўны Мінск раніцай 8 студзеня 2016 года сустрэне вялікую святыню — каўчэг з часцінкай мошчаў апостала Андрэя Першазванага. Па бласлаўленні мітрапаліта Керкірскага, Паксійскага і Дыяпантыйскіх астравоў Нектарыя яна будзе даступная для пакланення беларускім вернікам. Святыня будзе прынесена ў храм дабравернага князя Аляксандра Неўскага.

Работнікі падатковай службы змогуць карыстацца ў час кантрольнай закупкі банкаўскімі карткамі.

У Беларусі адменена абавязковая сертыфікацыя асобных бытавых паслуг. Размова ідзе пра цырульніцкія паслугі, а таксама паслугі хімчысткі, рамонту і тэхабслугоўвання бытавой радыёэлектроннай апаратуры, электрабытавых машын і прыбораў, транспартных сродкаў.

Зінедзін Зідан назначаны галоўным трэнерам іспанскага футбольнага клуба «Рэал». Кантракт разлічаны да 2018 года.

СВЯТЫ БЕЗ ЭКСТРЫМУ

Ва ўзмоцненым рэжыме працуюць першую дэкаду экстранныя службы Беларусі. За выключэннем трох дзён, амаль уся яна выдалася святочнай, аднак «дапамагаюць» яшчэ і моцныя халады, якія прыйшлі ў краіну следам за Новым годам...

Зіма, халады

Ужо даўно стала традыцыяй праводзіць стары год і сустракаць новы шумна. А нязменным атрыбутам гэтага часу года стала піратэхнічная кананада.

— Ад пачатку зімы канфіскавана амаль мільён адзінак разнастайнай піратэхнікі, — паведаміў **начальнік аддзела па масавых мерапрыемствах упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Уладзімір СТАНІЛЕВІЧ.** — Рублём пакаралі каля 220 прадаўцоў нелегальнага тавару. Усяго ж Новы год на вуліцах адсвяткавалі ў Беларусі больш за 320 тысяч чалавек. На мерапрыемствах ніякіх здарэнняў зарэгістравана не было.

— Тое ж адбылося на святочных ёлках і па нашым профілі, — гаворыць **першы намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Руслан ГАЎДУРОВІЧ.** — А вось у жылым сектары, на жаль, сітуацыя зусім не аптымістычная. З-за вельмі халоднага надвор'я абстаноўка з пажарамі рэзка абвастрылася. Людзі распальваюць печы і не заўжды сочаць за спраўнасцю сістэм, калі-нікалі і проста кураць у ложках нападпітку. Толькі за чацвёра першых сутак 2016-га адбылося 127 пажараў. У іх загінулі 27 чалавек, сярод якіх двое дзяцей. Апошняя трагедыя адбылася ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна ў ноч на панядзелак. А трэцяй гадзіне паступіў на пульт дзяжурнага выклік ад суседзяў. Калі нашы падраздзяленні прыбылі на месца падзей, то адстаяць будынак шанцаў ужо не было — ён гарэў адкрытым полымем, абрынуўся дах. Пасля высветлілася, што там пражывала сям'я з дзецьмі. Агонь забраў жыцці маці і дваіх малых, якім не споўнілася нават 10 гадоў...

Не зафіксавана сёлета і пажараў з-за піратэхнікі.

— А вось пацярпелыя ад яе ёсць, — зазначае **начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег ПАНЧУК.** — Праўда, іх значна менш, чым у мінулыя гады.

СТАР. 5

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

9 771990 763008 16002>

ГОДНА ЖЫЦЬ ПАД СТАРАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт закрануў тэму рэнты, калі дзяржава бярэ на сябе поўны клопат аб адзінокіх старых. «Мы павінны клапаціцца пра старых, з іх згоды забіраем ўласнасць і перадаём у распараджэнне дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў думку, што трэба правесці адпаведную рэвізію. «Але зрабіць гэта трэба нефармальна, разам з мясцовымі органамі ўлады, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Спытаць трэба і ў людзей, якія тут жывуць, яны раскажуць». Бо ёсць сітуацыі, калі старыя знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах, а сваю кватэру камусьці аддалі. Сустракаюцца і выпадкі з так званымі чорнымі рыэлтарамі. «Гэтых чорных рыэлтараў трэба адправіць куды трэба, на дзяржзабеспячэнне, толькі з іншымі формамі ўтрымання», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт запатрабаваў навесці належны парадак у гэтым пытанні, а таксама выявіць выпадкі, калі кватэры ў пажылых людзей фактычна адабралі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна дакладна вызначыць схему — як утрымліваць старых, якія ў гэтым маюць патрэбу, на вёсцы і ў горадзе, і хто будзе гэтым займацца.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна таксама лічыць, што клопат аб старых павінен заставацца ў руках дзяржавы. Паводле яе слоў, калі, напрыклад, здзелка аб адчужэнні ўласнасці праведзена на працягу трох гадоў, то размова можа ісці толькі аб платным утрыманні пажылых людзей. Яна таксама прапанавала павялічыць гэты тэрмін да пяці гадоў як мінімум.

Прэзідэнту расказвалі пра тое, што дом-інтэрнат «Світанак» быў адкрыты на базе рэканструяванага ў 2004—2010 гадах санаторыя. Тут пражываюць 92 чалавекі, у іх ліку 3 інваліды-калясачнікі, 18 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, 52 ветэраны працы. Іх сярэдні ўзрост — 81 год. На поўным дзяржзабеспячэнні знаходзяцца 47 чалавек, на платных умовах — 35 чалавек (маюць працаздольных членаў сям'і), 10 чалавек пражываюць на ўмовах пажыццёвага ўтрымання (рэнты). Усім ім прадастаўляюцца адно- або двухмесныя пакоі з асобнымі санвузламі, ваннай, створана безбар'ернае асяроддзе.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з умовамі пражывання і побыту ветэранаў, а таксама вельмі цёпла і душэўна пагутарыў з імі. Жанчыны атрымалі ў падарунак ад Прэзідэнта беларускія пуховыя хусткі, мужчыны — зімовыя шалікі.

Падчас чаявання Аляксандр Лукашэнка выслухаў кожнага з прысутных ветэранаў, спытаў ад праблемах. Як распавялі ветэраны, тут створаны ўсе неабходныя ўмовы для камфортнага пражывання і правядзення вольнага часу. У нязмушанай душэўнай гутарцы кіраўнік дзяржавы цікавіўся ў ветэранаў іх думкай па розных пытаннях. Як аказалася, пажылыя людзі ў курсе ўсіх падзей, якія адбываюцца ў краіне і свеце, яны сочаць за палітыкай.

Ветэраны падзякавалі кіраўніку краіны за падтрымку на дзяржаўным узроўні. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава і надалей будзе надаваць першачарговую ўвагу пажылым людзям і інвалідам.

■ Добрая навіна

ЛЯЧЭННЕ З КАМФОРТАМ

У Лоеве адкрыўся новы будынак цэнтральнай раённай бальніцы

На будаўніцтва бальніцы, разлічанай на 100 месцаў, скарыстана больш за Br97 млрд. Гэта сродкі абласнога бюджэту і фінансавыя рэсурсы, якія выдаткоўваюцца на мінімізацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Цяпер у бальніцы ёсць тэрапеўтычнае і хірургічнае аддзяленні, у якіх будуць выдзелены ложкі для хворых неўралагічнага, педыятрычнага і гінекалагічнага профіляў. Акрамя таго, адкрыты аддзяленні хуткай медыцынскай дапамогі і прыёмнае, прыбудаваны пераходная галерэя і харчаблок. У палатах усталяваны сістэмы назірання за пацыентамі, ёсць магчымасць тэрміновага выкліку персаналу. Аснашчана палата інтэнсіўнай тэрапіі, зала ЛФК, фізіятэрапеўтычны, эндаскапічны і рэнтгеналагічны кабінеты, кабінет ультрагукавой дыягностыкі і клінічная лабараторыя. У ёй, дарэчы, новае лабараторнае абсталяванне, якое дазволіць пашырыць спектр лабараторных даследаванняў і паскорыць працэс іх апрацоўкі. Укараненне сістэмы тэлеЭКГ у Лоеўскай ЦРБ дазволіць своечасова выяўляць сардэчна-сасудзістую паталогію ў пацыентаў аддаленых населеных пунктаў і неадкладна прымаць меры. Увод новага корпуса палепшыць якасць аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву Лоеўскага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Люстэрка грамадства

ДАВЕДАЦЦА БОЛЬШ... ПРА СЯБЕ

У Год культуры сацыёлагі Акадэміі навук даследуюць цывілізацыйны код беларусаў

Пра гэта падчас прэзентацыі кнігі «Беларусь на шляху ў будучыню: сацыялагічнае вымярэнне» расказаў дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Ігар КАТЛЯРОЎ. Паводле слоў навукоўцы, у свеце ўжо даўно надаюць высокую ўвагу пытанням нацыянальнай ідэнтычнасці, у нас жа праблема дагэтуль шырока не абмяркоўвалася.

«Трэба сказаць, што Беларусь ужо адназначна склалася як суверэнная краіна, якая рухаецца наперад, — лічыць спецыяліст. — Але мы, на жаль, рэдка гаворым пра свае нацыянальныя і культурныя адметнасці. Выдатных якасцяў у беларусаў вельмі шмат, і калі мы больш дэталёва вывучым усе гэтыя аспекты, то зможам карыстацца вынікамі для развіцця грамадства і дзяржавы».

У прыклад сацыёлаг прывёў Гану і Паўднёвую Карэю. Калі пасля Другой сусветнай вайны пачаўся распад каланіяльнай сістэмы, афрыканскі рэгіён разглядаўся як вельмі перспектыўны і багаты. Лічылася, што ў вельмі хуткім часе краіны «чорнага кантынента» пачнуць імкліва развівацца. Прыкладна на той жа ступені развіцця, што і краіны Афрыкі, тады знаходзілася Паўднёвая Карэя. Праз 50 гадоў сітуацыя карэнным чынам змянілася, і не на карысць афрыканцаў. Ігар Катляроў мяркуе, што менавіта ўвага да асаблівасцяў нацыі дазволіла карэйцам зрабіць такі вялікі скачок.

Само выданне, якое прадстаўлялі сацыёлагі, для Беларусі ўнікальнае. У ім шырока даследуюцца погляды і чаканні беларусаў ад наступных 15 гадоў існавання нашай дзяржавы. Кніга аналізуе самыя розныя аспекты грамадскага жыцця. Так, навукоўцы, напрыклад, зазначаюць, што стаўленне большасці ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу да айчыннай сістэмы адукацыі, якую многія крытыкуюць, аказалася станоўчым. Пры гэтым грамадзяне адзначаюць вялікую колькасць праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння: заробкі настаўнікаў, адсутнасць прэстыжу прафесіі і іншыя. Такія ж прапановы і заўвагі рэспандэнты зрабілі па многіх іншых аспектах, і іх погляды знайшлі адлюстраванне ў кнізе.

Акрамя таго, сацыёлагі расказалі пра кластар, які ствараецца на базе Інстытута сацыялогіі НАН. Як і іншыя ўстановы падобнага кшталту, ён скіраваны на даследаванні ў прарыўных кірунках, якія маюць сувязь з практыкай. Пры гэтым сацыёлагі будуць не толькі адзначаць сферы, што патрабуюць інавацый, але і апрабіраваць новыя падыходы.

Закраналася таксама тэма магчымага павышэння пенсійнага ўзросту. Актуальных даследаванняў з гэтай нагоды сацыёлагі пакуль не праводзілі, але апытанні 2013 года сцвярджаюць, што 18% беларусаў гатовы адкласці свой выхад на пенсію пры ўмове павышэння выплат. Увогуле, паводле слоў **загадчыцы аддзела сацыялогіі сацыяльных інавацый Інстытута сацыялогіі НАН Віялеты ШУХАТОВІЧ**, беларусы ставяцца да перспектывы павышэння пенсійнага ўзросту «з разуменнем». Але, як лічыць спецыяліст, такія змены павінны адбывацца паступова і адначасова з іншымі, у прыватнасці, з павышэннем якасці і даступнасці медыцынскіх паслуг. Ужо ў найбліжэйшы час сацыёлагі з Акадэміі навук правядуць анкетаванне і семінар з удзелам кіраўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па праблеме павышэння пенсійнага ўзросту.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Фінансы

КРЭДЫТНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

НАЦБАНК ЗАПУСЦІЎ ІНТЭРНЭТ-РЭСУРС, З ДАПАМОГАЙ ЯКОГА МОЖНА ДАВЕДАЦЦА ПРА СВОЙ КРЭДЫТНЫ РЭЙТЫНГ У РЭЖЫМЕ РЭАЛЬНАГА ЧАСУ

Спецыяльны сэрвіс https://creditregister.by дазволіць фізічным асобам праглядзець свае крэдытныя адносіны з банкамі і ацаніць, ці дадуць вам той ці іншы крэдыт. Раз на год падобную крэдытную справаздачу можна атрымаць бясплатна, а за другі і наступныя запыты давядзецца заплаціць. Сёння на web-партале Нацбанка праверыць сваю крэдытную гісторыю могуць толькі кліенты «Белгазпрамбанка», бо менавіта гэтая фінансавая ўстанова першая запусціла аўтэнтыфікацыю кліентаў у сістэме дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА). Спецыялісты Нацбанка сёння спадзяюцца, што ўжо ў наступным квартале да гэтага партала далучацца і астатнія банкі краіны.



Справаздача — на дом

Начальнік упраўлення «Крэдытны рэгістр» Нацыянальнага банка Віктар ПЛЁНКІН адзначыў, што раней, каб «пагартаць» сваю крэдытную гісторыю, трэба было прыйсці ў сталіцы ў крэдытны рэгістр па вуліцы Талстога, 6 (у рэгіёнах — у галоўныя ўпраўленні Нацбанка), напісаць заяву і толькі пасля гэтага атрымаць крэдытную справаздачу.

На новым сэрвісе кліенты могуць праверыць, хто запытваў іх крэдытныя гісторыі. Калі запыт быў ад таго, каму вы не давалі згоду, то гэта падстава паскардзіцца ў Нацбанк.

Актыўным карыстальнікам сецівa падобная працэдура здалася дастаткова нязручнай. Таму ў час лічбавых тэхналогій карыстаюцца такой паслугай літаральна адзінкі. Так, цяпер у банкаўскай сферы краіны існуе каля 4,5 мільёна крэдытных гісторый, а кожны месяц у банкі звяртаюцца па крэдыты каля 100 тысяч чалавек. Пры гэтым летась Нацбанк прадаставіў фізічным асобам усяго 2674 крэдытныя гісторыі.

Іншыя банкі — у рэжыме нізкага старту

Пакуль спецыяльны сэрвіс працуе ў тэставым рэжыме. Крэдытная гісторыя даступная толькі кліентам аднаго камерцыйнага банка, якія абслугоўваюцца там па сістэме ДБА. Менавіта на прыкладзе аднаго невялікага банка плануецца без вялікіх праблем адшукаць у новай сістэме слабыя месцы і выправіць магчымыя памылкі. Іншыя банкі цікавяцца гэтай сістэмай. Масавае ўкараненне яе ўжо на парозе. Літаральна праз месяц Нацбанк абяцае скласці дасканалыя патрабаванні для ўдзельнікаў. А пасля старту сістэмы міжбанкаўскай ідэнтыфікацыі доступ у яе атрымае любы карыстальнік банка.

Лепш мець рэйтынг ад А да В

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацбанка Павел ЗЫЛЬ удакладняе, што аўтэнтыфікацыя кліентаў адбываецца з тымі ж звесткамі, якія ён уводзіць, каб трапіць у асабісты кабінет банка. Потым партал проста перанакіроўвае яго на старонку аўтарызацыі банка. Кліент уваходзіць і далей можа бачыць выключна сваю крэдытную гісторыю.

У крэдытнай справаздачы кліент можа прасачыць, якія крэдыты і калі ён браў за ўвесь час, ці былі запазычанасці, а таксама даведацца пра свой скор-бал і крэдытны рэйтынг. Гэта адзін з момантаў, на якія банк звяртае ўвагу пры выдачы крэдытаў.

Для чаго карысна ведаць крэдытную гісторыю? Часам чалавек можа элементарна забыцца своечасова аплаціць крэдыт, а потым праз некалькі дзён выправіць сітуацыю. Можна быць паручыцелем у не зусім надзейных крэдытаатрымальнікаў. Усё гэта разам часам і ўплывае на асабісты крэдытны рэйтынг. А дакладныя звесткі крэдытнай гісторыі дазваляюць своечасова ацаніць уласныя магчымасці пры атрыманні крэдыту. «Напрыклад, калі ваш рэйтынг А-1 ці В-2, то верагоднасць атрымання крэдыту даволі высокая. А вось з рэйтынгам D або ніжэйшым могуць узнікнуць пытанні», — кажа Віктар Плёнкін. Аднак сістэма рэйтынгаў не з'яўляецца жорсткай схемай па прынцыпе чорных спісаў. Банкі заўсёды самастойна прымаюць рашэнне, выдаваць вам крэдыт ці не.

«Калі ваш рэйтынг А-1 ці В-2, то верагоднасць атрымання крэдыту даволі высокая. А вось з рэйтынгам D або ніжэйшым могуць узнікнуць пытанні».

Увогуле спецыялісты адзначаюць, што ў кожнага банка свае правілы, і менавіта банк прымае рашэнне. Як правіла, чым большы памер крэдыту (напрыклад, на куплю нерухомасці), тым больш жорсткія ўмовы яго атрымання. «Кожны банк сам вызначае крытэрыі для ацэнкі патэнцыйнага крэдытаатрымальніка. Крэдытны рэйтынг — гэта агульная гісторыя таго, як чалавек выконваў свае абавязацельствы ў мінулым. Крэдытны рэгістр не можа ўплываць на канчатковае рашэнне аб выдачы ці нявыдачы крэдыту, бо рашэнне прымае сам банк з улікам пэўнага крэдытнага прадукту», — удакладніў Павел Зыль.

Крэдытная гісторыя змяшчае асабістую інфармацыю — прозвішча, імя, дату нараджэння, асабісты нумар, пол, грамадзянства, месца рэгістрацыі. Акрамя таго, даступная інфармацыя аб бягучых і мінулых крэдытах, пазыках, паручыцельствах, закладах: калі і якім банкам выдадзены крэдыт, сума і тэрмін яго пагашэння, гісторыя аплаты запазычанасці, сумы і працягласць пратэрміновак, а таксама калі і якому банку прадастаўлена паручыцельства, заклад, сума і тэрмін забеспячэння.

Работа над памылкамі

Другім слушным момантам азнаямлення з такой інфармацыяй стане ўпэўненасць у тым, што крэдытаатрымальнік не атрымае чужых «грахоў». Суб'ект крэдытнай гісторыі можа праверыць свае абавязацельствы на прадмет памылак. Спецыялісты банкаўскай сферы ўпэўнены, што іх няшмат, але яны здараюцца. Тады можна проста падаць заяву, каб памылкі выправілі.

А яшчэ крэдытаатрымальнік можа падстрахавацца, калі яму здаецца, што нехта цікавіцца яго фінансамі звыш меры. На новым сэрвісе кліенты могуць праверыць, хто запытваў іх крэдытныя гісторыі. Калі запыт быў ад таго, каму вы не давалі згоду, то гэта падстава паскардзіцца ў Нацбанк. Без дазволу кліента запытваць крэдытную гісторыю могуць органы, пералічаныя ў 121-м артыкуле Банкаўскага кодэкса. Гэта праваахоўныя органы, падатковая інспекцыя і іншыя дзяржаўныя органы. І нават гэтыя структуры могуць пацікавіцца вашай крэдытнай гісторыяй толькі ў выключных выпадках.

Цяпер у банкаўскай сферы краіны існуе каля 4,5 мільёна крэдытных гісторый, а кожны месяц у банкі звяртаюцца па крэдыты каля 100 тысяч чалавек.

Далей узнікае пытанне аб абароне на партале такой канфідэнцыяльнай інфармацыі. На гэты конт Віктар Плёнкін запэўнівае, што праблемы крадзяжоў цалкам выключаюцца, бо сістэма прайшла атэстацыю адпаведнасці ў акрэдытаванай выпрабавальнай лабараторыі.

І хутчэй, і танней

Зараз крэдытная гісторыя ў папяровым варыянце выдаецца фізічнай асобе бясплатна раз на год. Адзін раз бясплатна можна атрымаць інфармацыю і на партале.

Сёння тыя, хто хоча атрымаць сваю крэдытную гісторыю другі і наступныя разы за год, плацяць 50 тысяч за справаздачу. Кіраўніцтва Нацыянальнага банка Беларусі спадзяецца, што да канца бягучага квартала платныя паслугі запрацуюць і ў сістэме анлайн. Распрацоўшчыкі партала ўпэўнены, што кошт прагляду ўласнай гісторыі будзе значна меншым за друкаваную справаздачу.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

НЯМА ТЫХ, ХТО ПРАЙГРАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адной адметнай рысай спартыўнага свята з'яўляецца традыцыя, якая ўжо чацвёрты раз становіцца неад'емнай часткай Каляднага турніру — гэта дабрачынная акцыя, падчас якой матэрыяльная дапамога будзе аказана дзецям. Сёння ўдзельнікі турніру наведаюць Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Там пражывае 86 выхаванцаў ад 5 да 18 гадоў. У рамках акцыі «Калядная традыцыя» Прэзідэнцкі спартыўны клуб акажа матэрыяльную дапамогу дзецям у памеры Br200 млн, а федэрацыя хакея — 100 млн. Таксама выхаванцы школы-інтэрната атрымаюць падарункі ад усіх камандаў-удзельніц 12-га Каляднага турніру аматараў хакея на прыз кіраўніка дзяржавы.

Адзначым, што такая добрая справа распачата арганізатарамі (Прэзідэнцкі спартыўны клуб і Федэрацыя хакея РБ) у 2013 годзе. Тады ў рамках 9-га Каляднага міжнароднага турніру арганізатары і каманды-ўдзельніцы ўпершыню аб'ядналіся, каб падарыць трохі радасці і каляднага цуду тым, хто так гэтага чакае — дзецям.

За ўсю гісторыю акцыі яе пачынальнікі аказалі дабрачынную дапамогу сямі сацыяльна-педагагічным цэнтрам Мінска, дзіцячаму дому сямейнага тыпу Мінскага раёна, Дзіцячаму гарадку Ленінскага раёна Мінска і Дзіцячай вёсцы «Вытокі». Усяго ў гэтых установах сёння пражываюць і выхоўваюцца каля 400 хлопчыкаў і дзяўчатак.

Пасі НІЕЛІКЯЙНЕН, каманда Фінляндыі:

— Я першы раз у Беларусі, але ў мяне склаліся вельмі прыемныя ўражанні ад наведвання вашай краіны. Думаю, наступіў момант, калі Фінляндыя павінна перамагчы на гэтым турніры, спадзяюся, на гэтым тыдні ўсё атрымаецца. Розніца з прафесійным хакеем тут, вядома, істотная, але ўсё роўна ўзровень высокі. Я б параўнаў Калядны турнір з другім дывізіёнам чэмпіянату Фінляндыі.

Эдуард БШАЙД, каманда Германіі:

— Добрыя гульцы, шмат гледачоў, усё гэта падымае настрой, пасля гульні можна схадзіць на дыскатэку, мне гэта падабаецца ў Мінску.

Міраслаў ШАТАН, каманда Славакіі:

— Мінск — вельмі добры горад, я памятаю гэта яшчэ з таго моманту, як гуляў тут на чэмпіянаце свету ўжо амаль два гады таму. Калядны турнір — гэта добрая нагода сустрэцца са старымі сябрамі і атрымаць задавальненне ад гульні.

■ Размова на роўных

ПАЧУЕМ ГОЛАС МАЛАДЫХ

Прадстаўнікі Савета лідараў працоўнай моладзі сталіцы абмеркавалі свае праблемы з намеснікам старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ігарам Карпенкам падчас пашыранага пасяджэння на базе ААТ «АМКАДОР» — кіруючая кампанія холдынга». Каля чвэрці супрацоўнікаў прадпрыемства складаюць маладыя спецыялісты, у тым ліку і з гэтай прычыны яно стала пляцоўкай для сустрэчы.

Так, напрыклад, прадстаўнік прадпрыемства «МАПІД» звярнуў увагу намесніка старшыні Мінгарвыканкама на зніжэнне аб'ёму будаўніцтва ў сталіцы і ваколіцах. Па яго словах, многія маладыя спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй па розных прычынах пакідаюць працу на будоўлях, пачынаецца цякучка кадраў. Ігар Карпенка згадзіўся, што праблема сапраўды існуе, але дзяржава робіць усё для яе вырашэння. Адзін з галоўных кірункаў працы — падтрымка дзяржаўных кампаній-забудоўшчыкаў. Ужо цяпер на розных узроўнях абмяркоўваецца магчымасць спрошчанага выдзялення ўчасткаў пад забудову прадпрыемствам дзяржаўнай формы ўласнасці, што павінна дапамагчы ў вырашэнні сітуацыі.

Па словах актывіста з МЗКТ, многім яго калегам не хапае часу на афармленне сваіх ідэй па ўдасканаленні вытворчасці адпаведна з патрабаваннямі Дзяржстандарта. Выйсце ён бачыць у стварэнні спецыяльных службаў, якія займаліся б гэтым на месцах. Аднак, па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама, увядзенне новых ставак на прадпрыемствах непазбежна паўплывае на сабекошт прадукцыі і на заробкі супрацоўнікаў. Вырашыць праблему можа развіццё практыкі настаўніцтва.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Пытальнік

ПЕРАСОЎВАННЕ ПА ТЭРЫТОРЫІ АЗС ПАВІННА БЫЦЬ БЯСПЕЧНЫМ

Паважаная рэдакцыя! Даўно хацеў праз газету звярнуцца да супрацоўнікаў ДАІ. Справа вось у чым. На трасе знаходзіцца АЗС. Я заехаў на запраўку, і мне трэба рухацца ў напрамку рыбгаса «Белае». Што я павінен рабіць? Выехаць на ажыўленую трасу, потым павярнуць налева на дарогу да рыбгаса? Але ж праследзіць і, галоўнае, больш бяспечна павярнуць налева там, дзе стаіць знак «Рух забаронены». Але гэты знак не дазваляе тое рабіць. Навошта там яго паставілі? Нядаўна ў гэтым месцы адбылася аварыя, калі аўто, заправіўшыся, павінна было ехаць у бок рыбгаса. Калі б кіроўца павярнуў там, дзе знак, аварыі не адбылося б.

Васіль ПЯШЭВІЧ, *вёска Юркевічы Жыткавіцкага раёна.*

Разам з лістом чытач даслаў і схему таго месца, пра якое ён напісаў. Усё гэта разам мы накіравалі ў АДАІ Жыткавіцкага РАУС. Неўзабаве рэдакцыя атрымала адказ на прапановы нашага падпісчыка адносна ўнясення змен у схему руху транспартных сродкаў на АЗС ДВА «Беларуснафта».

«Паведамляем, што парадак руху транспартных сродкаў на тэрыторыі АЗС рэгламентаваны пастановай Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь №38 ад 4 снежня 2003 года «Аб зацвярджэнні правіл тэхнічнай эксплуатацыі аўтазаправачных станцый». Згодна з п.19, «рух транспартных сродкаў па тэрыторыі АЗС павінен быць аднабаковым, пры гэтым павінны быць прадугледжаны асобныя ўезд і выезд». У сувязі з вышэйказаным, а таксама ў мэтах бяспекі перасоўвання транспартных сродкаў па тэрыторыі АЗС, унесці змены ў схему руху транспартных сродкаў на згаданай АЗС не ўяўляецца магчымым»

■ Тэхналогіі

СХАВАЦЦА Ў ІНТЭРНЭЦЕ ЦЯПЕР НЕМАГЧЫМА?

У новым годзе інфармацыйная прастора краіны ўжо не будзе ранейшай. Для тэлегледачоў навіна добрая — краіна цалкам перайшла на лічбавае вяшчанне. А вось для карыстальнікаў інтэрнэту — не вельмі, бо за іх дзеяннямі ў сеціве назіранне ўзмоцніцца.

АКНО Ў ЛІЧБАВЫ СВЕТ

З першага панядзелка года на ўсёй тэрыторыі Беларусі цяпер афіцыйна з'явілася лічбавае тэлевізійнае вяшчанне. Паводле дакументаў, прынятых яшчэ ў Жэневе, аналагавае тэлевяшчанне знікала, пачынаючы з 15 мая 2015 года. Разам з тым засталіся і аналагавыя частоты, якія не трапілі пад дзеянне жэнеўскіх дамоўленасцяў. Менавіта яны і спынілі сваю працу сёлета. Спецыялісты Міністэрства сувязі і інфарматызацыі стараліся наладзіць сваю работу такім чынам, каб пераход ажыццяўляўся плаўна. На працягу года ўсе, каму было неабходна, змаглі дакупіць абсталяванне і перайсці на лічбавае тэлебачанне, а для пакінутых частот прынялі рашэнне аб адключэнні толькі пасля свят. Лічбавае тэлевізійнае вяшчанне сёння даступна 99,41% насельніцтва Беларусі. Колькасць перадавальных станцый, якія забяспечваюць эфірную трансляцыю агульнадаступнага лічбавага пакета праграм, дасягнула 94. У гэты пакет уваходзяць «Беларусь 1», «АНТ», «СТВ», «Мір», «РТР-Беларусь», «НТБ-Беларусь», «Беларусь 2», «Беларусь 3», «Беларусь 5» і Першы Нацыянальны канал Беларускага радыё.

КУДЫ ЎЖО ПРАЗРЫСЦЕЙ?

З 1 студзеня беларускі інтэрнэт будзе пад наглядам. Цяпер правайдары абавязаны захоўваць звесткі карыстальнікаў аб тым, якія сайты яны наведваюць і якія паслугі выкарыстоўваюць. Адбывацца гэта будзе на працягу аднаго года з дня пачатку аказання паслуг па прадастаўленні доступу да глабальнай сеткі. Правайдары будуць захоўваць нумар і дату заключэння дагавора на аказанне паслуг электрасувязі; прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку; адрас карыстальніка або адрас ўстаноўкі канцавой абаненцкай прылады; звесткі, якія дазваляюць вызначыць карыстальніка інтэрнэт-паслуг або яго абаненцкую прыладу; МАС-адрас або ідэнтыфікацыйны нумар канцавой абаненцкай прылады карыстальніка інтэрнэт-паслуг; для абанентаў сеткі сотавай рухомай электрасувязі — рэквізіты дакумента аб асобе (яго назва, серыя, нумар, дата выдачы і найменне дзяржаўнага органа, які выдаў дакумент). Калі вы прадпрымальнік, то будуць захоўвацца звесткі аб вашым нумары і даце заключэння дагавора на аказанне паслуг электрасувязі; назва юрыдычнай асобы, юрыдычны адрас; адрас устаноўкі канцавой абаненцкай прылады карыстальніка інтэрнэт-паслуг; звесткі, якія дазваляюць вызначыць карыстальніка; МАС-адрас або ідэнтыфікацыйны нумар канцавой абаненцкай прылады карыстальніка інтэрнэт-паслуг сотавай рухомай электрасувязі. Акрамя таго, правайдар будзе захоўваць дату, час пачатку і заканчэння злучэнняў, унутраны і знешні IP-адрасы і парты канцавой абаненцкай прылады, даменнае імя або IP-адрас і порт інтэрнэт-рэсурсу, які наведваў карыстальнік, аб'ём перададзеных і прынятых даных. Дарэчы, так званымі ананімайзерамі кшталту Tor, якія ствараюць сетку ананімных тунэляў і дазваляюць перадаваць даныя ў зашыфраваным выглядзе, карыстацца неўзабаве таксама свабодна не атрымаецца, бо прадпрыемства па наглядзе за электрасувяззю «БелГІЭ» запусціла сістэму аўтаматычнага пошуку ананімайзераў. Запуск гэтай сістэмы зусім не значыць, што карыстацца імі стане немагчыма, але доступ да сайтаў, якія ўжо забароненыя, цяпер аўтаматычна будзе блакавацца і праз ананімныя сеткі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

Епіскап ВЕНЬЯМІН:

«УДЗЯЧНЫ ЗА МАГЧЫМАСЦЬ СЛУЖЫЦЬ ЛЮДЗЯМ І БОГУ»

Чытачы «Звязды» вось ужо больш за дваццаць гадоў сочаць за міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыяй «Дарога да святыняў». Ужо два гады яе акармляе епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, які напярэдадні Новага года стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне». За час служэння Беларускай Праваслаўнай Царкве ўладыка паспеў прайсці шлях ад паслушніка да епіскапа, узначаліць Выдавецкую раду БПЦ, затым — сінадальны аддзел рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі, стаць кіраўніком навастворанай Барысаўскай епархіі. Вядома, пра добрыя справы не расказваюць. Хутчэй, моўчкі збіраюць іх плады. Але спецыяльна для «Звязды» епіскап Веньямін паразважаў, ці здольны матэматык верыць у Бога, а адно слова — змяніць чалавечы лёс, і паспрабаваў адказаць на пытанне, чаму яму выпала атрымаць такую высокую ўзнагароду.

— У свой час вы атрымалі тэхнічную адукацыю і адпаведную спецыяльнасць. І ўжо праз некалькі месяцаў паступілі ў семінарыю. Так хутка прыйшлі да веры ці гэта быў лагічны крок па дарозе да яе?

— Шлях да веры ў кожнага чалавека непаўторны. Калі чалавек жадае жыць па запаведзях Божых і наследаваць жыццё вечнае, ці можа перашкаджаць у гэтым прафесія? Таму няма нічога дзіўнага, калі людзі з тэхнічнай адукацыяй і нават навукоўцы вераць у Бога і шмат часу аддаюць духоўным пытанням. Шмат хто з вялікіх вучоных — Эйнштэйн, Планк, Ньютан, Мендзялееў — былі глыбока веруючымі. Адно аднаму не перашкаджае. Хаця, безумоўна, па-рознаму можна выкарыстоўваць прызванне Божае ў сваім жыцці.

Асновы веры былі закладзены ў мяне яшчэ ў дзяцінстве. Бабуля была вельмі набожная. Непісьменная, але шчырая вернiца. Яна страціла мужа, які загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Адна выхоўвала дзяцей. І, нягледзячы на цяжкасці і смутак пасляваеннага часу, дзякуючы сваёй веры яна выжыла, выгадавала дзяцей і стала для мяне прыкладам чалавека цiхмянага, цярплівага, шчодрага, які глыбока верыць. Яе паважалі ўсе аднавяскоўцы. Яе вобраз, нашы сумесныя гутаркі адклалі пэўны адбітак. Пасля, калі ўжо вучыўся ў школе, ва ўніверсітэце, шмат што было забыта. Але калі храмы пачалі зноў адкрывацца, адраджалася царкоўнае жыццё на Беларусі, таксама стаў цікавіцца праваслаўем і згадаў тыя веды, што ў дзяцінстве атрымаў ад бабулі.

— Пасля прынялі манаства і паступова дайшлі да епіскапскага сану. У вас столькі послухаў зараз! Адкрыйце, калі ласка, сакрэт: як усё паспяваеце?

— За ўсе гэтыя гады послухаў сапраўды было шмат, але з таго часу, як стаў кіраваць Барысаўскай епархіяй, іх стала меней. На жаль, нельга адразу ўсё сумяшчаць. Вядома, усё паспяваць складана, таму даводзіцца прасіць дапамогі ў Бога. Яго спагадай атрымліваецца штосьці рабіць. Вядома ж, і сіламі добрых, надзейных памочнікаў. Шмат добрых спраў адбываецца менавіта дзякуючы ім.

— Вы таксама часта наведваеце дзіцячыя дамы і інтэрнаты, хворых дзетак. Як вы лічыце, што для іх больш важна ў размове, у адносінах з валанцёрамі ці гасцямі: духоўнае ці матэрыяльнае?

— Зараз дзіцячыя дамы наведваю як кіруючы архірэй — па абавязках. Але, па шчырасці, адчуваю неабходнасць хрысціяніна дапамагаць тым, хто мае патрэбу. У такога кшталту ўстановах усё з неабходнага ёсць, але душа ў выхаванцаў шукае чагосьці большага: сардэчнай прыхільнасці, шчырай размовы, любові, падтрымкі, спачування. Не заўжды гэта павінна быць шкадаванне, якое часам можа і пакрыўдзіць дзяцей. І па прыродзе сваёй душы ім уласціва цягнуцца да духоўнага. Але калі духоўныя патрэбы не знаходзяць патолі, тады чалавек задавольваецца душэўнымі радасцямі. Калі не мае і іх, то звяртаецца да матэрыяльных.

— Ці можна за кароткае наведванне паспець даць дзіцяці крыху любові?

— Безумоўна. Зразумела, што лепей, калі дзіцячыя дамы наведваюцца духоўнымі асобамі з пэўнай перыядычнасцю: раз на тыдзень ці на месяц. Лепей першае. Каб усё ж такі тое духоўнае, што закладваецца на працягу каротkай размовы, захавалася да наступнай сустрэчы і паступова назапашвалася.

Часам так выходзіць, што дарослыя зрабілі ўсё, каб дзяцей парадаваць, вывесці з задумення, але на іх тварах усё адно застаецца знак суму. Тое, наколькі нашы дзеі і словы дасягаюць сэрцаў іншых, вельмі індывідуальна для кожнага з выхаванцаў і часта непрадказальна.

— Ужо каму, калі не вам, яшчэ нядаўна старшыні Выдавецкай рады Царквы, ведаць, ці здольнае слова змяніць лёс чалавека?

— Слова шмат што можа змяніць у нашым жыцці. Часта людзі раздражнёныя, якія не маюць міру ў душы, пачуюць чалавека, які гаворыць ціха і лагодна, і супакояцца, задумаюцца. Мне не раз даводзілася бачыць такіх асоб. Слова Божае нам паведамляе, што «ад паўнаты сэрца гавораць вусны». Калі чалавек мае паважлівае стаўленне да людзей, душэўную цеплыню, любоў, то сваім словам зможа змякчыць сэрца таго, хто паступае няслушна, і будзе пачутым.

У адным з месцаў зняволення праводзілася апытанне пра тое, якую б кнігу яны хацелі мець у сябе. І амаль усе называлі адну — Біблія. Безумоўна, яна і Новы Запавет дапамагаюць чалавеку зірнуць на гэты свет і сэнс жыцця па-іншаму, натхніцца жыць па-новаму. Безумоўна, існуюць і іншыя кнігі, якія растлумачаць тую ж ісціну. Напрыклад, у творах старца Паісія (Святагорца) простымі, даступнымі кожнаму словамі расказваецца пра дабрачыннасць, страсці, духоўную барацьбу, сямейныя пытанні, малітву. Гэтыя кнігі вылучаюцца прастатой і ў той жа час глыбіннай мудрасцю. Прападобнага Паісія, дарэчы, нядаўна залічылі да ліку святых.

— Калі азірнуцца на пражытыя гады, на ўсё спасцігнутае і зробленае, ці можаце вы самі сабе даць адказ, за што вас узнагародзілі?

— Я задаваў сабе такое пытанне. За што? Раблю тое, што павінен, і шмат хто працуе гэтак жа сама ў Царкве на такіх жа пасадах. Апостал Павел кажа, што гора таму, хто не робіць тое, што абавязаны. А калі я атрымліваю за гэта ўзнагароду, то гляджу на яе як на стымул больш працаваць і бачу пэўны дакор у тым, што зроблена яшчэ не ўсё магчымае.

— Прысуджэнне прэміі — гэта прызнанне ад людзей. А якія ў вас ёсць узнагароды ад Бога?

— Магчымасць служыць у прастола Божага — ужо вялікі дар. Іаан Златавуст ставіць епіскапскае служэнне святара нават вышэй за царскае. Разам з тым гэта і магчымасць служыць у духоўнай сферы і свайму народу. Духоўнасць шмат у чым вызначае лёс кожнага з нас і ў выніку — будучыню ўсёй краіны. Гэтую адказнасць і ўзнагароду я прымаю са шчырай удзячнасцю.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

ПАДЗЯКА І ВЕРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны з нас, для каго Гасподзь — Айцец Нябесны, абавязкова павінен прынесці да Віфлеемскіх ясляў яшчэ адзін дар — любоў: любоў адзін да аднаго, да ўсіх навакольных людзей — гарачую і дзейсную, бо «па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі любоў будзеце мець паміж сабою» (Ін. 13: 35). Побач з намі заўсёды ёсць тыя, хто пакутуе, падае духам, адчайваецца, старыя і нядужыя, хворыя, гаротныя і самотныя. Неабходна разумець, што там, дзе няма любові, узаемнай падтрымкі і адказнасці, гатоўнасці ўсё жыццё прынесці ў дар тым, каго любіш, там няма ні шчасця, ні радасці, ні паўнаты быцця. Гасподзь і Спасіцель чакае ад верных дзяцей Святой Царквы добрых пладоў — служэння любові і міласэрнасці дзеля нашых бліжніх.

Год мінулы, міласцю Божай, прынёс нам нямала духоўнай радасці. Ён быў адзначаны шматлікімі добрымі здзяйсненнямі ў жыцці нашай Царквы, якія таксама сталі своеасаблівымі падарункамі Богадзіцяці Хрысту.

У дні святкавання Раства Госпада і Спасіцеля нашага Царква Хрыстова заклікае да радаснай і ўдзячнай малітвы, і мы ўзносім хвалу і падзяку ўцялесненаму Сыну Божаму, Які прынёс на зямлю вечнае збаўленне, любоў і мір, за ўсе Яго дабрадзействы і міласці, дараваныя ў мінулым годзе, за Яго ўсемагутную дапамогу, што ўмацоўвала нас у выпрабаваннях, якія мы пераадольвалі з верай і спадзяваннем на Бога.

Любоў і мірнае адзінства прынёс на зямлю Гасподзь наш Ісус Хрыстос: «няхай усе будуць адно: як Ты, Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, так няхай і яны ў Нас будуць адно» (Ін. 17: 21). Найвышэйшая мэта, указаная Спасіцелем, які прыйшоў на зямлю, — мірнае адзінства людзей у адзінстве з Богам, у адной праваслаўнай веры, у Адзінай, Святой, Саборнай і Апостальскай Царкве. Як верныя дзеці Хрыстовы, усе мы павінны клапаціцца пра захаванне адзінства Святой Праваслаўнай Царквы.

Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, выступаючы на XIX Сусветным Рускім народным саборы з дакладам «Спадчына князя Уладзіміра і лёс гістарычнай Русі», адзначыў, што «ў год 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра мы звяртаемся да спадчыны, якую ён нам пакінуў... Спадчына заўсёды змяшчае ў сабе запавет, заахвочвае нашчадкаў да дзеяння. Відавочна, што асноўны і самы каштоўны для нас сэнс спадчыны роўнаапостальнага князя — гэта сэнс рэлігійны: гэта прынятая народам вера Хрыстова». Выбар Хрысціцеля Русі «дазволіў народу раскрыць свае здольнасці і таленты ў лоне хрысціянства, выявіць сябе ў служэнні ўсяленскай ісціне Хрыстовай і ў межах гэтага служэння стварыць уласную цывілізацыю».

Першасвяціцель заклікаў усіх «адчуць і асэнсаваць адзіны гістарычны шлях, які пачаўся з Хрышчэння Русі: ім мы крочылі скрозь усе выпрабаванні да перамог, менавіта гэты шлях адкрывае нам перспектыву будучыні. Гэтая перспектыва — захаванне і будаўніцтва нашай самабытнай цывілізацыі, якая абапіраецца на ўніверсальны хрысціянскі падмурак і ўлічвае нацыянальныя пачаткі народаў. Такі для нас найважнейшы ўрок спадчыны святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Мы павінны быць вартымі гэтай спадчыны, абавязаны захаваць яе і перадаць наступным пакаленням», — падкрэсліў найсвяцейшы Патрыярх Кірыл.

Дарагія і ўзлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, айцы, браты і сёстры! Зноў і зноў віншую вас са светлым і радасным святам Раства Хрыстовага і малітоўна зычу невычэрпнай дабрадатнай дапамогі Божай у вашай працы дзеля славы Беларускай Праваслаўнай Царквы, дзеля славы Бацькаўшчыны нашай — благаславеннай Белай Русі, на радасць усім нашым бліжнім. Амінь.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

У БІБЛІЯТЭКАХ КАНІКУЛЫ ВЕСЯЛЕЙШЫЯ

У дні зімовых канікул Наваполацкая бібліятэка імя У. Караткевіча запрасіла наведвальнікаў прыняць удзел у святочных мерапрыемствах. Каб яны надоўга запомніліся, арганізатары пастараліся іх зрабіць вясёлымі, напоўненымі цудамі, гульнямі, конкурсамі.

— У створаным «чароўным замку» арганізаваны выстава і кінапаказ. Казачныя персанажы ўручаюць першым чытачам сувеніры. Сувеніры зрабілі ў бібліятэчнай «мартышчынай кают-кампаніі» разам з валанцёрамі са школы №12. У гульнятэцы «Чытаем, фантазіруем, гуляем!» Снежная каралева чытае дзецям казкі. Упадабаных падчас праслухоўвання жывёл можна намаляваць на пяску, — паведамілі ў Наваполацкім гарвыканкаме.

Па выніках мінулага года былі вызначаны самыя лепшыя чытачы ў розных намінацыях. І бібліятэкары, каб з пераможцаў бралі прыклад, падрыхтавалі стэндавую прэзентацыю «Чытач — ты лепшы!». Самыя актыўныя ўзнагароджаныя дыпломамі і не толькі. Юным чытачам былі ўручаны падарункі-сюрпрызы. А дарослыя атрымалі падарункавыя сертыфікаты на бясплатнае карыстанне камерцыйным абанементам на працягу студзеня.

А ў дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака можна ўбачыць калекцыю паштовак розных гадоў «Падарожжа навагодняй паштоўкі» (па 10 студзеня). Экспанаты — з асабістай калекцыі супрацоўніка бібліятэкі і падораныя чытачамі. Самая старая паштоўка, прадстаўленая на выставе, надрукавана ў 1969 годзе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ФІЛАСОФІЯ + АНГЛІЙСКАЯ МОВА

Адзінаццацікласнікі Ліцэя БДУ Уладзіслаў Войніч і Павел Бялькевіч прадставяць Беларусь на міжнароднай алімпіядзе па філасофіі ў 2016 годзе. Яна адбудзецца ў маі ў Бельгіі.

Пуцёўку на прэстыжныя спаборніцтвы ліцэісты заваявалі ў выніку перамогі ў алімпіядзе па філасофіі сярод школьнікаў, арганізаванай факультэтам філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Акрамя таго, яшчэ дзевяць старшакласнікаў сярэдніх навучальных устаноў былі адзначаны дыпломамі рознай вартасці.

Юных філосафаў экзаменавалі ў два туры. Першы праводзіўся завочна, а другі этап быў вочным. Яго ўдзельнікі на працягу 120 хвілін пісалі эсэ на англійскай мове на адну з чатырох прапанаваных тэм. Кожны ўдзельнік выбіраў для каментавання і наступнага філасофскага асэнсавання выказванні Арыстоцеля, Васіля Разанава, Людвіга Вітгенштэйна або кітайскага мысляра Лю Цзуньюаня. Ліцэісты БДУ Уладзіслаў Войніч і Павел Бялькевіч выбралі для сваіх работ выслоўі Людвіга Вітгенштэйна і Арыстоцеля.

Пры ацэнцы эсэ канкурсантаў улічваліся не столькі веды па філасофскіх дысцыплінах, колькі ступень разумення філасофскіх аспектаў праблемы, паслядоўнасць і лагічнасць выкладання думак, пераканаўчасць аргументаў і арыгінальнасць самой працы. У вочным туры ў БДУ прынялі ўдзел 26 навучэнцаў з 9 навучальных устаноў Мінска і Гродна.

Міжнародная алімпіяда па філасофіі сярод школьнікаў праводзіцца пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі філасофскіх таварыстваў пры падтрымцы ЮНЕСКА. Мерапрыемства скіравана на папулярызацыю філасофіі. Беларусь удзельнічае ў гэтых спаборніцтвах толькі з 2014 года.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

«СНЕЖНАЯ КАРАЛЕВА» ПА-БЕЛАРУСКУ

Віцебскі Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа парадаваў дзятву прэм'ерным спектаклем «Снежная каралева». Паказы беларускамоўнай версіі адной з самых папулярных казак у свеце прайшлі з поўным аншлагам.

Пераклад зрабіў Леанід Дранько-Майсюк, а рэжысёр-пастаноўшчык музычнай казкі — Міхась Краснабаеў. Мастак-пастаноўшчык — Святлана Макаранка, кампазітар — Арцём Краснабаеў, аўтар тэкстаў песень — Алесь Замкоўскі. Казка «Снежная каралева» неаднаразова рабілася аб'ектам увагі многіх тэатральных рэжысёраў. І не дзіва: яна вельмі падыходзіць для стварэння захапляльнага дзіцячага спектакля. У спектаклі занятыя заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова і артыстка Анжаліка Баркоўская (роля Бабулі), артысты Аляксей Аніселя і Дзмітрый Каваленка (Кай), Настасся Веранёва (Герда) і іншыя, — паведамілі ў літаратурна-драматычнай частцы тэатра.

Сёлета ў тэатра юбілей: 90 гадоў з дня стварэння. Свята запланавана на 21 лістапада. Непасрэдна да святкавання юбілею на вялікай сцэне адбудзецца прэм'ера спектакля «Каласы пад сярпом тваім» паводле аднайменнага рамана Уладзіміра Караткевіча (рэжысёр Валерый Анісенка). У пастаноўцы будзе задзейнічана ўся трупа тэатра.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

■ Фотарэпартаж

СІЛІЧЫ:

У мінулыя выхадныя ў горналыжным цэнтры «Сілічы» адбылося адкрыццё асноўнай спускавой трасы. Нягледзячы на халоднае надвор'е, было шмат ахвотнікаў выпрабаваць першы сіліцкі снег новага сезона.



СНЕЖНА, ЛЮДНА, ГАРАЧА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З КАЗАЧНАЙ РЭЗІДЭНЦЫІ Ў НАРОД

Ужо больш за 700 чалавек з Беларусі, Расіі, Латвіі пабывалі ў рэзідэнцыі полацкага Дзеда Мароза. На Каляды галоўны навагодні казачны персанаж і яго памочнікі паедуць развозіць дзятве падарункі і дарыць святочны настрой.

Дзед Мароз у Полацку.

Анатоль МАРЦІНКЕВІЧ (газета «Полацкі веснік»).

— Рэзідэнцыя Дзеда Мароза на полацкай зямлі працуе другі раз. Яна адкрыта на базе аддзела турызму, краязнаўства і экскурсій раённага Цэнтра дзяцей і моладзі. Гасцей там чакаюць па 10 студзеня. Усе ахвотныя могуць у рэзідэнцыі прыняць удзел у майстар-класах па вырабе навагодніх сувеніраў, наведаць чароўныя сувенірныя крамы. Працуе навагодняя кавярня «Марозка», — паведаміў «Звяздзе» **намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Пётр ПЯТКЕВІЧ.**

Экскурсія ў рэзідэнцыю — гэта цікавы квест. У лесе цудаў ёсць Чароўная сцежка і балота Кікімары, Паляна навагодніх сюрпрызаў. Можна ўбачыць Урочышча мядзведзіцы і шмат чаго яшчэ. Ля ёлкі арганізуецца навагодні кастынг талентаў з гульнямі, забавамі і карагодамі. Удзельнікам кастынгу гарантаваны салодкі прыз ад Дзеда Мароза. У полацкай рэзідэнцыі таксама працуе навагодні пункт пракату лыж. Добра, што снегу ў новым годзе багата.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

«СЭРЦА ЖЫВОЕ НЯСУЦЬ КАЗАХСТАНА...»

У Выдавецкім доме «Звязда» падрыхтавана да друку кніга казахскага вучонага, пісьменніка і асветніка Немата Келімбетава «Зайздрасць».

Немат Келімбетаў — з кагорты тых аўтараў, якія найперш цікавяць чытача ўдумлівага, здольнага асэнсоўваць рэчаіснасць, па-філасофску аглядаць розны час, розныя падзеі. Ужо вядомыя ў Беларусі яго кнігі «Не хачу губляць надзею», «Лісты да сына». Цяпер перакладзена на беларускую мову і кніга «Зайздрасць». Днямі яна выйдзе з друку. Што цікава, у новым беларускім выданні філасофскай прозы Немата Келімбетава ў якасці прадмовы, уступнага слова змешчаны вершы трох беларускіх паэтаў — Міколы Мятліцкага, Генадзя Аўласенкі, Юліі Алейчанкі. Усе творы прысвечаны Немату Келімбетаву. «Мы не бязродныя ў стэпе шырокім,/ Памяць не выстудзяць ветры злавесныя./ Там, дзе сыходзяцца з долам аблокі, / Крочаць прародзічы — цюркі Нябесныя./ Рушаць дарогай гісторыі пыльнаю,/ Сонца над імі — крывавая рана./ Шэпчуць нам, сыне, не скаргі магільныя — / Сэрца жывое нясуць Казахстана...» (Мікола Мятліцкі).

— Мы вельмі ўдзячны беларускім калегам за такую паслядоўнасць у знаёмстве чытачоў вашай краіны з творчасцю Немата Келімбетава, — гаворыць казахская пісьменніца Райхан Мажэнкызы. — Прыемна, што прайшлі прэзентацыі яго кніг у Мінску і іншых гарадах Беларусі. Мноства рэцэнзій, водгукаў, якія з'явіліся ў друку і прысвечаны кнігам казахскага асветніка, сведчаць пра неабыякавае стаўленне да яго творчасці. А цяпер вось уразілі і вершаваныя водгукі вядомых паэтаў на знаёмства з лёсам, творчасцю Келімбетава. Прыкуты да ложка, аўтар спавядальнай кнігі «Не хачу губляць надзею» шмат для каго з'яўляецца прыкладам жыццясцвярджальнасці, ён падобны да беларускі Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі, якая вярнулася з вайны без рук і ног. Мне здаецца, што аповесць Немата Келімбетава, іншыя яго творы асабліва важна прачытаць маладым людзям, якія думаюць, разважаюць над тым, якім павінна быць жыццё, з каго гэтае жыццё рабіць.

Варта нагадаць, што ў Выдавецкага дома «Звязда» ўвогуле склаліся добрыя адносіны з казахскімі літаратарамі. Гэта відаць і па многіх творчых праектах беларускіх літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў. З іх старонак да чытача прыйшлі на беларускай мове творы сучасных пісьменнікаў Казахстана Нурлана Аразаліна, Святланы Ананьевай і іншых паэтаў і празаікаў.

Сяргей ШЫЧКО.

ДЗЕ ЖЫЦЬ БУДЗЕМ?

У ГОРКАХ УЗЯЛІСЯ ЗА БУДАЎНІЦТВА І ЭКАЛОГІЮ

Летась у Горках былі ўзведзены два 40-кватэрныя маналітныя жылыя дамы. Мясцовыя ўлады паклапаціліся, каб утульней стала на ўскраінах горада і ў дварах жылых дамоў. Больш падрабязна на гэту тэму мы пагутарылі з намеснікам старшыні Горацкага райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы, будаўніцтве і архітэктуры Андрэем КАМКО.

— Нягледзячы на цяжкія эканамічныя ўмовы, у райцэнтры паспяхова вядзецца будаўніцтва жылля. Праўда, што ў гэтым актыўны ўдзел прымаюць і самі гараджане?

— Сапраўды, у адным з жылых дамоў, які мы здалі, упершыню палова кватэр зроблена за грошы жыльцоў. Што датычыцца будаўніцтва індывідуальнага жылля, то тут крыху не дацягнулі да выканання задання. Але ж упершыню пабудавана 5400 квадратных метраў жылля, а раней ніколі больш за 4000 квадратных метраў не будавалі. Калі працягваць тэму будаўніцтва, то сёлета мы ўвялі другую чаргу МТФ у вёсцы Маслакі. Гэта стала магчыма дзякуючы сродкам падрадчыка АТ «Будаўнік» і намаганням самой гаспадаркі СВК «Маслакі», якая выканала работы гаспадарчым спосабам.

— Сёння шмат увагі надаецца навядзенню парадку на зямлі...

— Мы першыя з райцэнтраў вобласці пачалі ўсталёўваць заглыбленыя кантэйнеры. З-за абмежаванасці вольнага месца была праблема з арганізацыяй кантэйнерных пляцовак па зборы смецця ў раёне жылых дваро ў на вуліцах Вакзальная, 2 і Фрунзэ. Зараз набыты і ўсталёўваюцца 2 заглыбленыя кантэйнеры, якія займаюць няшмат месца (на 2/3 яны знаходзяцца пад зямлёй) і пры гэтым ёмістыя (разлічаны на аб'ём ад 3 да 5 кубічных метраў) і нават маюць аўтаномную сістэму пажаратушэння. Перавагі яшчэ і ў тым, што пры такім зборы смецця захоўваецца эстэтычны выгляд пляцоўкі і няма ніякага непрыемнага паху. Праблема вырашаецца за кошт уласных сродкаў мясцовага прадпрыемства «Камунальнік». Да ведама, адзін такі кантэйнер каштуе 21 мільён рублёў.

А яшчэ за сродкі аператара другасных рэсурсаў мы набылі лінію сартавання камунальнага смецця. Цяпер вядуцца пусканаладачныя работы па запуску гэтай лініі на месцы былой вытворчай базы ў вёсцы Славікі, дзе раней сартаванне вялося ўручную. Прапускная здольнасць абсталявання — 5 тысяч тон за год.

— Як вырашаецца праблема будаўніцтва інжынерных сетак і дарог у кварталах індывідуальнай забудовы?

— Некалькі гадоў таму пры падрыхтоўцы горада да святкавання абласных «Дажынак» за дзяржаўны кошт былі зроблены каналізацыйныя сеткі мікрараёнаў Галінка 1 і 2. На чарзе мікрараёны Галінка 3 і 4, а таксама Слабада. Але ўсё ўпіраецца ў фінансаванне. Крыху лепш становішча па Галінцы 3 — прынамсі праект будаўніцтва каналізацыйнай сеткі мы зрабілі. Але, каб пачаць работы, трэба згода жыхароў на ўдзел у фінансаванні. Мы сустракаемся з насельніцтвам, але людзі не вельмі зацікаўлены плаціць за тое, што іншым дасталася бясплатна... Да таго ж працягласць вуліц вялікая і грошы патрабуюцца немаленькія. Ездзілі пераймаць вопыт у Кобрын, дзе будаўніцтва інжынерных сетак з самага пачатку вялося з прыцягненнем сродкаў жыхароў. У Горках атрымалася дамовіцца з жыхарамі дзвюх вуліц працягласцю па 150 метраў. Там людзі не супраць стварэння калектываў індывідуальнай забудовы. З іх плануем і пачынаць. Яны бяруцца за асабістыя сродкі распрацаваць праектную дакументацыю і набыць будматэрыялы. Астатнія работы будуць выконвацца за кошт бюджэтных сродкаў.

Знаходзім аптымальныя рашэнні і па будаўніцтве дарог. У мікрараёне Галінка 2 па праекце павінна была паявіцца асфальтабетонная дарога, але мы ўзгаднілі замену яе на цэментна-бетонную, што больш адпавядае інтарэсам дзяржавы. Тым больш што пры гэтым выкарыстоўваецца айчынны прадукт — бетон, які вырабляюць нашы заводы. Прыватным прадпрыемствам «Праметэй» набыты за ўласныя сродкі бетонаўкладчык, і на сярэдзіну снежня было ўжо зроблена 1685 метраў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 снежня 2015 года
Ухвалены Саветам Рэспублікі 18 снежня 2015 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1703) наступныя змяненні і дапаўненне:

1. У частцы другой артыкула 4 слова «крэдытавання» замяніць словам «фінансавання».

2. У артыкуле 10:

у частцы другой:

у абзацы трэцім словы «лізінгу (фінансавай арэнды)» замяніць словамі «фінансавай арэнды (лізінгу)»;

у абзацы чацвёртым словы «якія выдаюцца» замяніць словамі «у тым ліку па мікракрэдытах, якія прадастаўляюцца»;

у абзацы чацвёртым частку трэцяй словы «лізінгу (фінансавай арэнды)» замяніць словамі «фінансавай арэнды (лізінгу)»;

частку чацвёртую пасля слова «крэдытаў» дапоўніць словамі «, у тым ліку мікракрэдытаў,».

3. У артыкуле 11:

абзац чацвёрты часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«у статутным фондзе якіх доля Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, замежных юрыдычных асоб, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, грамадскіх аб'яднанняў (за выключэннем грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў), саюзаў (асацыяцый), фондаў, адной або некалькіх юрыдычных асоб, якія не з'яўляюцца суб'ектамі малога прадпрымальніцтва, перавышае 49 працэнтаў (за выключэннем суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва);»;

у частцы трэцяй:

абзац чацвёрты выключыць;

абзацы пяты—сёмы лічыць адпаведна абзацамі чацвёртым—шостым;

абзац шосты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«у гэтага суб'екта маюцца страты па выніках фактычна адпрацаванага часу ў бягучым годзе на дату звароту па аказанне дзяржаўнай фінансавай падтрымкі.».

4. Артыкул 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 12. Маёмасная падтрымка суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва

Для суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва заканадаўствам могуць быць прадугледжаны меры маёмаснай падтрымкі ў выглядзе:

прадастаўлення ў бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, іншай нерухомай маёмасці (за выключэннем незавершаных закансерваваных капітальных пабудоў), машын, абсталявання, транспартных сродкаў, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, а таксама ва ўласнасці гаспадарчых таварыстваў, у статутных фондах якіх больш за 50 працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і (або) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

прымянення паніжальных каэфіцыентаў да базавых ставак пры разліку стаўкі арэнднай платы пры арэндзе капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, а таксама ва ўласнасці гаспадарчых таварыстваў, у статутных фондах якіх больш за 50 працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і (або) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

права пераважнага набыцця па рыначным кошце капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, іншай нерухомай маёмасці суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, якія належным чынам выконваюць свае абавязацельствы па дагаворы арэнды (бязвыплатнага карыстання) не менш за тры гады, з прадастаўленнем растэрміноўкі аплаты да пяці гадоў з штомесячнай індэксацыяй плацяжоў з дня заключэння дагавора куплі-продажу, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўствам могуць быць прадугледжаныя і іншыя меры маёмаснай падтрымкі суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.».

5. Частку трэцюю артыкула 14 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Удзел суб`ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў працэдурах дзяржаўных закупак тавараў (работ, паслуг) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг).».

6. Артыкул 23 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 23. Таварыства ўзаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва

Таварыствам узаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва з'яўляецца некамерцыйная арганізацыя, якая ствараецца суб'ектамі малога і (або) сярэдняга прадпрымальніцтва ў арганізацыйна-прававой форме спажывецкага кааператыва для акумулявання часова свабодных грашовых сродкаў членаў гэтага таварыства і сродкаў з іншых незабароненых крыніц у мэтах аказання ім фінансавай дапамогі ў форме прадастаўлення мікразаймаў.

Членамі такога кааператыва могуць быць выключна суб'екты малога і (або) сярэдняга прадпрымальніцтва.

Таварыства ўзаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва мае права прадастаўляць мікразаймы толькі асобам, якія з'яўляюцца членамі такога таварыства, і толькі на мэты ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

Асаблівасці парадку стварэння таварыстваў узаемнага фінансавання суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, склад і кампетэнцыя органаў кіравання і кантролю, правы і абавязкі членаў такіх таварыстваў вызначаюцца нарматыўнымі прававымі актамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.».

Артыкул 2. Гэты Закон уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

30 снежня 2015 года, г. Мінск № 344-З

■ Падрабязнасці

ПА САБЕКОШЦЕ — ПРАЗ ДВА ГАДЫ

Энергетычны сектар краіны плануе цалкам адмовіцца ад перакрыжаванага субсідавання ўжо да 2018-га

Аб гэтым паведаміў **намеснік міністра энергетыкі Беларусі Вадзім ЗАКРЭЎСКІ.** Сёння львіную долю выдаткаў насельніцтва на аплату розных відаў энергіі прымае на свае плечы рэальны сектар эканомікі. Паводле інфармацыі спецыяліста, цяпер узровень аплаты выдаткаў фізічнымі асобамі па электраэнергіі складае 72%, газу — 55%, а цеплавой энергіі — толькі 17,3%. Пазбавіцца ад перакрыжаванага субсідзіравання праз два гады па электрычнасці і газе цалкам рэальна, чаго не скажаш пра цяпло. У ацяпляльны сезон насельніцтва плаціць усяго 6,8 долара за адну гігакалорыю цяпла, у той час, як прадпрыемствам гэта адзінка цяпла каштуе ўжо 46 дораў.

Таму долю кампенсацыі выдаткаў насельніцтвам па цяпле трэба павялічваць, упэўнены спецыяліст. Налета плануецца павялічыць узровень аплаты насельніцтвам выдаткаў па цеплавой энергіі да ўзроўню 18-19%. Разам з тым, тарыфы ЖКГ дазваляецца павялічваць толькі ў канкрэтнай звязцы з павелічэннем даходаў насельніцтва. «Менавіта таму рэзкага росту камунальных тарыфаў для насельніцтва не плануецца», — адзначыў намеснік міністра.

Купляем у суседкі таннейшую электраэнергію...

Налета наша краіна плануе імпартаваць з Расіі 2,5 млрд кВт·гадз. электраэнергіі, пра што паведаміў **першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ДВА «Белэнерга» Аляксандр СІВАК.** «Пакуль лічба па імпарце ацэньваецца на ўзроўні 2,5 млрд кВт.гадз. — аб такім аб'ёме ёсць дамоўленасць з Расійскай Федэрацыяй. Гэта ва ўмовах эканамічнай мэтазгоднасці, паколькі мы можам збалансавацца самастойна», — адзначыў першы намеснік гендырэктара. Ён даў, што Беларусь імпартуе электраэнергію для таго, каб знізіць выдаткі на энергазабеспячэнне краіны.

Паводле інфармацыі Мінэнерга, Беларусь валодае дастатковай колькасцю міждзяржаўных сувязяў па лініях электрапередач 330-750 кВт з энергасістэмамі суседніх дзяржаў (Расіі, Украіны, краін Балтыі), што дазваляе, зыходзячы з наяўных балансаў суседніх энергасістэм, вызначаць напрамкі паставак электраэнергіі ў краіну. Так, сёлета экспартныя пастаўкі энергіі ў Літву склалі каля 200 млн кВт·гадз.

...і газ

Кіраўніцтва Мінэнерга разлічвае на зніжэнне цаны ў 2016 годзе расійскага газу ў памеры больш за некалькі дзясяткаў долараў на 1 тысячу кубічных метраў. Вадзім Закрэўскі адзначыў, што цяпер з расійскім бокам праводзяцца кансультацыі, падчас якіх абмяркоўваецца магчымасць змяншэння кошту газу і яго канчатковая велічыня на мяжы. Наша краіна закупляе газ па 142,4 долара за 1 тысячу «кубоў».

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Імідж — усё!

НА ІНШЫХ ПАГЛЯДЗЕЦЬ І СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

Міжнародныя выставы — эфектыўны спосаб наладзіць кантакты і прадэманстраваць магчымасці Беларусі

Выставы, як вядома, з'яўляюцца эфектыўнымі інструментамі для прасоўвання беларускіх тавараў, а таксама выдатнай магчымасцю для экспарцёраў усталяваць дзелавыя кантакты і прарэкламаваць айчынную прадукцыю.

Сёння сусветная эканоміка функцыянуе ва ўмовах крызісу перавытворчасці. Згодна з ацэнкамі экспертаў, колькасць тавараў, якія вырабляюцца ў свеце, у 1,5-2 разы перавышае попыт на іх. Відавочным становіцца тое, што ў сучасных умовах недастаткова проста вырабляць тавар, неабходна ўмець яго прарэкламаваць. Штогод у свеце праводзяцца тысячы рэкламных мерапрыемстваў. Выставачная дзейнасць — гэта цэлая высокапрыбытковая індустрыя. Без інвестыцый у яе канкурыраваць на знешніх рынках становіцца немагчыма. Як адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення забеспячэння знешнеэканамічнай дзейнасці — начальнік аддзела садзейнічання экспарту дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці МЗС Павел УЗЯТКІН,** сёння краіна эфектыўна пашырае геаграфію ўдзелу ў міжнародных выстаўках. Акрамя традыцыйных пляцовак СНД, айчынная прадукцыя заваёвывае форумы краін далёкай дугі. Напрыклад, у 2015 годзе беларускія дэлегацыі ўдзельнічалі ў такіх мерапрыемствах у Камбоджы, Кітаі, Бразіліі, Егіпце, Катары, Канадзе і ЗША. За год краіна таксама прыняла ўдзел у 11 буйных нацыянальных выставачна-кірмашовых мерапрыемствах за мяжой. Гэта былі 9 нацыянальных экспазіцый Беларусі, сярод якіх экспазіцыі на Міжнародным зялёным тыдні ў Берліне, на Гановерскай прамысловай выставе-кірмашы, на выстаўцы тавараў краін ШАС у КНР. Акрамя таго, было забяспечана правядзенне 2 выставак-кірмашоў Беларусі за мяжой — у Сочы і Ашхабадзе. **Начальнік аддзела каардынацыі выставачна-кірмашовай і кангрэснай дзейнасці МЗС Глеб МАРТЫНАЎ** падкрэсліў, што ўдзел у падобных мерапрыемствах мае вялікае значэнне яшчэ і для паляпшэння іміджу краіны. «ЭКСПА-2015» у Мілане, па папярэдняй інфармацыі арганізатараў, наведалі 21 млн чалавек, а наш беларускі павільён — каля 2 млн. Гэта велізарная лічба, якую нельга параўнаць з любой іншай выставай», — адзначыў ён.

У Ашхабадзе прадставілі 200 новых відаў беларускіх тавараў, 15 прадпрыемстваў упершыню прэзентавалі сваю прадукцыю на рынку Туркменістана. Было падпісана кантрактаў на 10,5 млн долараў. Цяпер Беларусь пачала падрыхтоўку нацыянальнай экспазіцыі на «ЭКСПА-2017» у Астане. Выстава будзе прысвечана энергетычнай тэматыцы. Ужо стварылі арганізацыйны камітэт, які зараз пачынае практычную працу па падрыхтоўцы. Падобныя выставы з'яўляюцца найбольш маштабнымі мерапрыемствамі і прадугледжваюць будаўніцтва нацыянальных павільёнаў, да падрыхтоўкі якіх патрабуецца высокапрафесійны падыход.

Варта таксама адзначыць, што ўсё больш замежных прадпрыемстваў хочуць удзельнічаць у выстаўках унутры Беларусі. Яшчэ ў 2013 годзе міжнародныя выставы складалі менш за 50% ад агульнай колькасці ўсіх мерапрыемстваў. У планах на 2016 год іх колькасць павінна скласці больш за 73%. Доля замежных экспанентаў у сярэднім вагаецца на ўзроўні 20%, і гэтая колькасць пастаянна расце. Ёсць таксама шэраг выставак накшталт харчовай індустрыі, метала- і дрэваапрацоўкі, «Атамэкспа Беларусь», «Беларускі транспартны тыдзень», «Адукацыя і кар'ера», дзе доля замежных удзельнікаў складае каля 40-50%. Штогод у іх удзельнічаюць прадстаўнікі больш як 50 краін свету. У рамках гэтых мерапрыемстваў падпісваюцца перспектыўныя дакументы. Напрыклад, падчас «Беларускага транспартнага тыдня» падпісалі мемарандумы аб супрацоўніцтве з літоўскімі чыгункамі. Гэта сапраўды дазваляе выходзіць на новыя рынкі, а форумы таксама служаць пляцоўкай для атрымання вопыту нашымі прадпрыемствамі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Устойлівае развіццё

КАНТЭЙНЕРАЎ СТАНЕ БОЛЬШ, А ПАЛІГОНАЎ — МЕНШ

Летась у краіне ўжо сабрана 538,5 тысячы тон другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), што складае 110% ад папярэдніх паказчыкаў.

— Дзякуючы пазыцы Сусветнага банка завяршаецца будаўніцтва смеццеперапрацоўчага завода ў Гродне. Потым плануем пабудаваць аналагічнае прадпрыемства ў Віцебску. Завяршаецца праектаванне першай чаргі завода ў Мінску, — адзначыў **кіраўнік упраўлення камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Раман АЛЕЙНІКАЎ.** Таксама ён адзначыў, што пры фінансавай падтрымцы дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» закупаюцца сучасныя смеццявозы з задняй загрузкай, ацынкаваныя і пластмасавыя кантэйнеры, адкрываюцца новыя прыёмныя пункты па зборы другасных матэрыяльных рэсурсаў. **Кіраўнік упраўлення ДМР «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў» Сяргей ЮРЧА** дадаў, што на ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы сёлета выдзелены 141 мільярд беларускіх рублёў. У наступным годзе плануецца ўсталяваць каля 1300 кантэйнераў у Мінску і прыблізна 2,5 тысячы ў астатніх рэгіёнах. Як паказвае практыка, большай папулярнасцю ў жыллёва-камунальных службаў карыстаюцца ацынкаваныя кантэйнеры. Зараз у Беларусі ўсталявана каля 84 300 кантэйнераў для раздзельнага збору, з іх 24 тысячы — для шкла, 33 тысячы — для пластыку, 7 тысяч — для змешаных ДМР, 19 700 — для паперы.

Вядзецца вялікая праца па інфармаванні. Напрыклад, зараз рыхтуецца серыя ролікаў, у якіх расказваецца пра шлях адходаў, якія трапілі ў кантэйнер для раздзельнага збору. Выдаюцца тэматычныя брашуры, буклеты, у школах праводзяцца тэматычныя часы.

Што датычыцца Мінска, то, па словах **намесніцы генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіны ГІЛЕВІЧ,** у сталіцы стараюцца замяняць старыя кантэйнеры на сучасныя, бо яны большыя па аб'ёмах.

Дырэктар прадпрыемства «Беларускі навукова-даследчы цэнтр «Экалогія» Валерый КЛЮЧАНОВІЧ падняў тэму палігонаў для цвёрдых бытавых адходаў. Так, за апошнія шэсць гадоў колькасць міні-палігонаў скарацілася з чатырох тысяч да 2317. Сёння ў Беларусі зарэгістравана 170 палігонаў. Вядзецца праца па іх закрыцці альбо мадэрнізацыі.

Ёсць тэхналогіі па перапрацоўцы тэкстылю і ўпакоўкі тэтра пак. Аднак няма прадпрыемства, якое б узялося за гэтую працу. Па словах Валерыя Ключановіча, з фінансавага пункту гледжання падобныя ініцыятывы не будуць рэнтабельнымі, паколькі няма дастатковых аб'ёмаў такіх адходаў. Больш выгадна вывазіць іх на перапрацоўку ў суседнія краіны.

Кацярына РАДЗЮК. *radziuk@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У прыярытэце — «сацыялка»

Магілёўскія дэпутаты зацвердзілі бюджэт наступнага года.

Напярэдадні раёнам Магілёўскай вобласці давялося прайсці сапраўдную абарону сваіх мясцовых бюджэтаў, бо кожны пункт аналізаваўся з асаблівай дасканаласцю. У вобласці падыходзілі да мэтанакіраванасці тых ці іншых прапаноў з пункту гледжання дбайнай эканоміі. Абласны бюджэт сфарміраваны з улікам рэалізацыі артыкулаў першай неабходнасці.

Амаль 66% (10,3 трыльёна рублёў) будзе накіравана на сацыяльную сферу: выплату заробкаў, трансферыў насельніцтву, аплату камунальных паслуг, прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў і гэтак далей. Для сферы адукацыі прадугледжана 4,9 трыльёна рублёў, аховы здароўя — 3,7 трыльёна. Даходы бюджэту Магілёўскай вобласці вызначаны ў суме 16 трыльёнаў рублёў, а выдаткі — 15,6 трыльёна. Як адзначалася на абласной выніковай сесіі, фінансавы год будзе вельмі няпростым у плане выканання ўсіх абавязацельстваў для рэгіёна, паколькі на яго прыпадае пік разлікаў па крэдытах і пазыках. Таму галоўная задача, якая стаіць перад кіруючай вертыкаллю, — гэта павелічэнне даходнай часткі бюджэтаў раёнаў і гарадоў, максімальны адыход ад датацый.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Не чакай эфекту ад «дзіўнай сілы»

Міністэрства гандлю прызнала неналежнай рэкламу «Дзіўная сіла прыроды».

Сюды, а таксама ва ўпраўленні гандлю і паслуг аблвыканкамаў сталі паступаць звароты грамадзян аб размяшчэнні і распаўсюджванні праз абаненцкія паштовыя скрыні рэкламных лістовак у выглядзе газетных старонак, якія змяшчалі інфармацыю пра лячэбныя ўласцівасці прадукцыі («100 дароў», «Літаалей», «Эфектум», «Экстракт алоэ па Фёдараву», «Мядарыя»). Пры гэтым яна не з'яўляецца лекавым сродкам або выратам медыцынскага прызначэння», — растлумачылі ў прэс-службе.

Спецыялісты Мінгандлю адзначылі, што, як правіла, у такой рэкламе ўтрымліваецца інфармацыя аб правядзенні выстаў-продажаў у розных гарадах Беларусі (у дамах культуры, кавярнях і ў іншых аб'ектах). «Пры гэтым такія выставы-продажы, як паказвае практыка, праводзяцца з парушэннем патрабаванняў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў. У прыватнасці, да спажыўцоў не даводзіцца ў поўным аб'ёме абавязковая інфармацыя аб прадукцыі, якая рэалізуецца, або даводзіцца недакладная інфармацыя пра яе ўласцівасці (напрыклад, лячэбныя), а таксама распаўсюджваецца неналежная рэклама», — адзначылі ў прэс-службе. Мінгандлю засцерагае спажыўцоў ад набыцця згаданай прадукцыі ў надзеі на яе лячэбны эфект. Зараз у абласцях прымаюцца меры па спыненні размяшчэння (распаўсюджвання) неналежнай рэкламы «Дзіўная сіла прыроды» і прыцягненні парушальнікаў да ўстаноўленай заканадаўствам адказнасці, а таксама па праверцы правамернасці рэалізацыі тавараў на выставах-продажах.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Новы цэх у Іванаве

У Іванаве ўрачыста адкрылі новы цэх па вытворчасці прадукцыі з малочнай сыроваткі. Запуск у эксплуатацыю прадпрыемства плошчай у 6000 квадратных метраў стаў вынікам паспяховага завяршэння інвестыцыйнага праекта «Арганізацыя вытворчасці сухіх малочных прадуктаў» Бярозаўскага сыраробчага камбіната.

Іванаўская пляцоўка поўнасцю аснашчана італьянскім абсталяваннем. Чакаецца, што праект акупіцца за пяць гадоў. Цяпер тут за суткі будзе перапрацоўвацца да 600 тон малочнай сыроваткі, якая ў нядаўнім мінулым лічылася сухім адходам малочнай вытворчасці. А прадукцыя новага цэха абяцае стаць разнастайнай. Гэта, напрыклад, сухія сыраватачна-тлушчавыя канцэнтраты, сухая сыроватка розных відаў, малако сухое абястлушчанае, малако сухое цэльнае, вяршкі сухія. Частка з названай прадукцыі выкарыстоўваецца ў жывёлагадоўлі, частка — у кандытарскай прамысловасці. Такім чынам, увод у эксплуатацыю новага цэха паспрыяе выкананню задачы імпартазамяшчэння. Акрамя таго, паводле планаў, некаторыя віды прадукцыі пойдуць на экспарт.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Гэта ж як можна было «заправіцца»...

Гандлёвая інспекцыя Міністэрства гандлю праверыла 19 крамаў і кафетэрыяў сеткі заправак «Беларуснафта» (РУП «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка»), размешчаных на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці, і ва ўсіх выявіла парушэнні патрабаванняў заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў.

Практычна паўсюдна не захоўваўся або не адпавядаў заканадаўству асартыментны пералік тавараў, да ведама пакупнікоў не даводзілася неабходная і дакладная інфармацыя аб таварах і іх вытворцах, парушаўся парадак афармлення цэннікаў і г.д.

У 11 з 19 аб'ектаў спынена рэалізацыя тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці на агульную суму больш за 2,4 мільёна рублёў, пра што паведамілі ў прэс-службе міністэрства. У ліку пратэрмінаваных выяўлены як харчовыя тавары (каўбасныя вырабы, сыры, слабаалкагольныя напоі, шакалад і іншае), так і нехарчовыя (лямпы напальвання, элементы сілкавання, аўтакасметыка і г.д.). Па выніках праверкі распачаты адміністрацыйны працэс у дачыненні да 17 службовых асоб арганізацыі і непасрэдна юрыдычнай асобы.

ТЫМ ЧАСАМ

Міністэрствам гандлю прынята рашэнне аб аднаўленні працы крамаў «MART INN»: ва ўсіх гандлёвых аб'ектах выпраўлены парушэнні заканадаўства, а таксама пагашана запазычанасць перад пастаўшчыкамі тавараў на суму больш за 100 мільярдаў рублёў. Грашовыя сродкі былі вернуты 63 малочным прадпрыемствам, больш за 30 мясаперапрацоўчым арганізацыям, звыш 50 пастаўшчыкам хлебапрадуктаў, 33 пастаўшчыкам кандытарскіх вырабаў і г.д. Падчас праверкі было складзена больш за 30 пратаколаў аб адміністрацыйных парушэннях.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Класныя навіны

ГРОШЫ ПОЙДУЦЬ ЗА ВУЧНЕМ

Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе пашыраны. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 30 снежня 2015 года №1109. Праект накіраваны на ўдасканаленне механізмаў бюджэтнага фінансавання ў сістэме адукацыі. У рамках эксперымента аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, «прывязваюцца» да колькасці навучэнцаў.

Нагадаем, што ў 2015 годзе эксперыментам былі ахоплены ўсе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі горада Баранавічы: 5 гімназій, 1 ліцэй і 15 сярэдніх школ. У 2016 годзе ў эксперымент будуць уключаны таксама ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі Жодзіна, Магілёва, Скідаля, Наваполацка; установы агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаныя ў Лідскім раёне, Савецкім раёне горада Гомеля, у Першамайскім раёне сталіцы, і асобныя ўстановы, якія вызначыць Міністэрства адукацыі.

Новы механізм прадугледжвае фарміраванне бюджэту ўстановы на падставе сярэднегадавых паказчыкаў колькасці навучэнцаў розных катэгорый (па ступенях навучання, колькасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і колькасці вучняў, якія наведваюць групы падоўжанага дня), нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў і карэктуючых каэфіцыентаў. Аб'ём бюджэтных сродкаў, якія накіруюць на рэалізацыю пілотнага праекта, будзе разлічвацца, зыходзячы з базавага нарматыву, вызначанага ўрадам для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. **У 2016 годзе базавы нарматыў на аднаго навучэнца складае 12 929 800 рублёў для гарадскіх школ і 28 177 100 рублёў — для школ, размешчаных у сельскай мясцовасці.** Пры гэтым уводзяцца наступныя карэктуючыя каэфіцыенты: напрыклад, для навучэнца сярэдняй школы на I ступені навучання і 1-4 класаў гімназіі каэфіцыент роўны 0,803, для навучэнца з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, які навучаецца ў спецыяльным класе, — 0,997 і г.д.

Мяркуецца, што новы механізм забяспечыць больш рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, што ў выніку адаб'ецца і на заробках педагогаў. Таксама чакаецца, што будзе створана здаровая канкурэнцыя паміж установамі адукацыі за кожнага вучня, што павінна адбіцца і на якасці іх навучання.

Педагагічным работнікам школ, якія ўдзельнічаюць у пілотным праекце, па рашэнні мясцовых улад могуць устанаўлівацца галіновыя павышэнні тарыфных ставак (акладаў) на ўмовах і ў памерах, вызначаных Міністэрствам адукацыі. Справаздача аб рэалізацыі пілотнага праекта павінна паступіць у Савет Міністраў да 1 лютага 2017 года

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

КЛІНІКА ПА ЕЎРАПЕЙСКІХ СТАНДАРТАХ

У Магілёве адкрыўся першы ў краіне корпус экстранай медыцынскай дапамогі

Сучаснае аддзяленне экстранай дапамогі размясцілася ў сценах чатырохпавярховай прыбудовы да хірургічнага корпуса гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Фота БЕЛТА.

— Паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы стварае добрыя ўмовы працы для персаналу і аказання хуткай медыцынскай дапамогі пацыентам. Гэта спрыяе бесперапыннасці прафілактычных, дыягнастычных і лячэбных працэсаў, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ,** перадаючы ўстанове сертыфікат наміналам 3,5 мільярда рублёў.

Падчас экскурсіі можна было на свае вочы ўбачыць, як будзе працаваць аддзяленне новага пакалення. З першых хвілін пацыенты будуць трапляць у строга вызначаную зону, дзе ў залежнасці ад стану свайго здароўя атрымаюць увесь пералік неабходных абследаванняў. Прадугледжана нават антывандальная зона для людзей пад алкагольным або наркатычным уздзеяннем. Гэтыя пацыенты здольны паралізаваць працу ўсяго аддзялення.

На другім паверсе корпуса размешчана рэанімацыя, на трэцім — экстраная таксікалогія, на чацвёртым — эндаскапія і лабараторыя.

— Адкрыццё такога корпуса — галоўная падзея ў маштабах усёй краіны, — адзначыў **галоўны пазаштатны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя Алег РУМО.** — Некалькі гадоў таму змяненні ў беларускай медыцыне і павышэнне вось да такога ўзроўню пачаліся менавіта з Магілёва. У 2002 годзе ў гэтай жа бальніцы быў зроблены агульны шматпрофільны аперацыйны модуль з высокаэфектыўным абсталяваннем, які прыйшоў на змену разрозненым аперацыйным аддзяленням. Гэты вопыт быў узяты на ўзбраенне ўсімі хірургічнымі цэнтрамі краіны. Зараз зроблены яшчэ адзін знакавы крок, бо па такім прынцыпе і падабенстве пабудаваны ўсе суперсучасныя аддзяленні экстранай дапамогі ў свеце, у тым ліку ў Германіі і Амерыцы. Такія карпусы з'явяцца ва ўсіх абласных цэнтрах нашай краіны, а потым і ў найбольш буйных гарадах.

Наогул, у Магілёўскай вобласці для паляпшэння аказання медыцынскай дапамогі ў Асіповічах будуецца раённая бальніца, у вёсцы Доўгае Крычаўскага раёна пасля капрамонту ўведзена бальніца сястрынскага догляду, працягваецца рамонт карпусоў Клічаўскай бальніцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Мы ў свеце

НЕ КОЖНАЯ ПРАЦА СПРЫЯЕ РАЗВІЦЦЮ

Працоўная галіна Еўропы і Цэнтральнай Азіі патрабуе новых падыходаў, больш спрыяльных магчымасцяў занятасці для ўсіх мужчын і жанчын, гаворыцца ў прэзентаваным Праграмай развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый «Дакладзе аб чалавечым развіцці 2015».

Чалавечае развіццё азначае расшырэнне дыяпазону выбару для людзей, пры гэтым у цэнтр увагі ставіцца багацце чалавечага жыцця, а не проста эканомікі. Важную ролю тут адыгрывае працоўная дзейнасць, якая займае значную частку жыцця любога чалавека на планеце. З 7,3 млрд жыхароў Зямлі 3,2 млрд працуюць на працоўных месцах, астатнія занятыя доглядам, творчай, валанцёрскай працай або рыхтуюцца стаць работнікамі. Праца павышае ўзровень чалавечага развіцця, даючы даход і сродкі да існавання, дазваляючы ўдзельнічаць у жыцці грамадства і забяспечваючы пачуццё ўласнай годнасці і значнасці. Механічнай жа сувязі паміж працай і чалавечым развіццём не існуе, бо праца прымусовая наогул наносіць удар па чалавечым развіцці, а праца на шкоднай і небяспечнай вытворчасці падвяргае людзей рызыцы.

Глабалізацыя, дэмаграфічныя змены, буйныя міграцыйныя патокі, хуткі тэхналагічны прагрэс і дэградацыя навакольнага асяроддзя могуць узмацніць няроўнасць і перакрэсліць нядаўнія дасягненні ў галіне развіцця. Сёння краіны могуць замацаваць свой поспех, калі ў большай ступені зробяць акцэнт на адукацыі і кваліфікацыі, удзеле ў жыцці грамадства і сацыяльнай абароне. Узровень занятасці ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі складае 51 працэнт (рэгіён займае перадапошняе месца сярод рэгіёнаў, якія развіваюцца). У той жа час беспрацоўе сярод моладзі дасягае амаль 20 працэнтаў, а ў некаторых краінах гэтая праблема яшчэ больш вострая. На долю рэгіёна таксама прыпадае значная колькасць мігрантаў і работнікаў нефармальнага сектара, не ахопленых якой-небудзь сацыяльнай абаронай. У многіх краінах рэгіёна нізкія тэмпы прыросту насельніцтва, міграцыя і імклівае старэнне насельніцтва прыводзяць да зніжэння яго колькасці і скарачэння працоўнай сілы — таго, што называюць «вычэрпваннем дэмаграфічнага дывідэнду». Такім чынам, неабходны эканамічныя пераўтварэнні, новыя веды і навыкі. Развіццё ведаў і навыкаў, перадача тэхналогій і барацьба з няроўнасцю паміж пакаленнямі могуць дапамагчы пераадолець няпростую сітуацыю.

Новыя магчымасці ў галіне працы павінны адкрыцца перад жанчынамі. У краінах, якія развіваюцца ў рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі, гендарная няроўнасць ніжэйшая, чым у іншых рэгіёнах, што развіваюцца. А звязана гэта найперш з нізкай мацярынскай смяротнасцю. Даклад заклікае краіны паляпшаць жыццё жанчын — забяспечваць ім роўную аплату працы, прадастаўляць дастойны бацькоўскі водпуск па доглядзе дзіцяці і інш.

Даклад прапануе трыадзіную праграму дзеянняў. Гэта новы сацыяльны дагавор паміж урадамі, грамадствам і прыватным сектарам — каб пры фармуляванні палітычных захадаў улічваліся патрэбы ўсіх членаў грамадства, асабліва тых, хто працуе не ў фармальным сектары. Гэта глабальны курс урадаў — для гарантыі работнікам правоў і льгот. І гэта праграма ў галіне годнай работы — для роўнасці і бяспекі.

Даклад ПРААН змяшчае і новы рэйтынг паказчыкаў індэкса чалавечага развіцця ў розных краінах і тэрыторыях. Беларусь займае 50-е месца. Аналагічную пазіцыю займае і Расія, што з'яўляецца найлепшым паказчыкам сярод краін СНД. Індэкс разлічваецца на падставе чаканай працягласці жыцця пры нараджэнні, сярэдняй працягласці навучання і чаканай працягласці навучання, ВУП на душу насельніцтва (у доларах ЗША па парытэце спажывецкай здольнасці).

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

СВЯТЫ БЕЗ ЭКСТРЫМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усяго да медыкаў з пашкоджаннямі ад піратэхнікі звярнуліся 27 чалавек, трох з іх мы шпіталізавалі. Адзін з іх — адзінаццацігадовы хлопчык з Гродна, які атрымаў пашкоджанне правай кісці... Прыкметна больш людзей да нас звярнулася з-за галалёдных і холадавых траўмаў. Іх 418 чалавек, прыкладна чвэрць з якіх трапілі ў бальніцы.

Як жа засцерагчы сябе ад такіх непрыемнасцяў? Забудзьце пра высокія абцасы і нерыфленыя падэшвы. Асабліва гэта датычыцца ўжо паношанага абутку, на якім рэльеф пратэктара ўжо мог выраўнавацца. Крочыць трэба спакойна, ступню падымаць мінімальна. Тым, хто ўжо дасягнуў паважанага ўзросту або мае якія-небудзь хранічныя захворванні, медыкі раяць пры паніжэнні тэмпературы да тых лічбаў, якія рэгіструюцца цяпер, да мінімуму скарачыць выхады на вуліцу. З улікам узроставых змен арганізма наступствы траўмаў могуць быць куды больш сур'ёзныя.

— Дзесяць чалавек мы шпіталізавалі з-за пераахалоджання. Зразумела, цяжэй за ўсё тым, хто працуе на адкрытым паветры, аднак і свае магчымасці перабольшваць не трэба. Часта ж бывае, як у глыбінцы: выпіў чалавек і пачаў збірацца ў суседнюю вёску, да якой некалькі кіламетраў. А сіл сваіх не разлічыў, прысеў па дарозе адпачыць. І... больш ужо не падняўся.

А на выхадных у Пінску замёрз чалавек у сваім доме. На Новы год мясцовы жыхар запрасіў гасцей. Калі яны пайшлі, то чамусьці замкнулі дзверы і пакінулі ключ звонку. Гаспадар хаты прачнуўся і вылезці з дома, які раптам стаў пасткай, не здолеў. Клікаць на дапамогу ён нікога не стаў і вырашыў выбрацца з дома самастойна праз акно. Але забыўся на тое, што ў аконным праёме былі прымацаваны дошкі, якія служылі імправізаванай абаронай супраць зладзеяў. Так мужчына і захрас. Яго цела праз некаторы час знайшоў сусед...

Рыбалку лепш адкласці

Хоць ртутны слупок яшчэ каля тыдня таму апусціўся далёка ўніз за нуль градусаў, спецыялісты раяць адкласці зімовую рыбалку яшчэ на некалькі дзён, пакуль лёд набярэ трываласць. Сёлета кроткі лёд ужо паспеў адабраць адно чалавечае жыццё.

— Трагедыя здарылася 1 студзеня на рацэ Сож у межах Гомеля, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Рыбак па неасцярожнасці выйшаў на край палонкі і раптоўна апынуўся ў халоднай вадзе. Амуніцыя зацягнула яго ўніз літаральна за некалькі хвілін.

Па папярэдніх звестках, за мінулы год за цягу да рыбалкі на неакрэплым лёдзе жыццём заплацілі дванаццаць чалавек. Яшчэ чацвёра не вярнуліся дадому з-за таго, што вырашылі падурэць на вадаёмах або скараціць праз іх шлях. Двое з іх назаўжды засталіся няпоўнагадовымі...

— Хоць лёд ужо і пачаў нарастаць, аднак бяспечных для чалавека мінімальных сямі сантыметраў таўшчыні ён пакуль не дасягнуў, — працягвае Алег Баразна. — Асабліва гэта датычыцца праточных вадаёмаў, месцаў, дзе скідваецца адпрацаваная вада, а таксама аб'ектаў побач з цеплавымі электрастанцыямі. Там, дзе вада стаячая — напрыклад на азёрах, — больш-менш трывалы лёд ужо пачаў з'яўляцца. Але перш чым на яго выходзіць, трэба выпрабаваць на ўстойлівасць. Зрабіць гэта вельмі проста — паспрабаваць прабіць лёд пешнямі, колам або іншым падручным сродкам. Калі трымае — значыць, выходзіць можна. Ды і перасоўвацца па лёдзе трэба асцярожна. Падазроныя месцы варта абмінуць як мага здалёк. Да іх адносяцца выхады ручаёў, крынічак, месцы, дзе ў лёд умерзла трава. А калі вы рухаецеся групай, то трымайце дыстанцыю не менш за пяць метраў адзін ад аднаго.

Але самы надзейны спосаб, з дапамогай якога можна даведацца, наколькі трывалы лёд, яшчэ больш просты і бяспечны. Дастаткова патэлефанаваць на найбліжэйшую ратавальную станцыю Таварыства ратавання на водах. Таўшчыня лёду маніторыцца спецыялістамі, якія працуюць там, штодзённа. Яны і падкажуць, ці можна ўжо выходзіць на лёд.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

БЫЛО СПАКОЙНА...

А вось піратэхніка бяды нарабіла

У навагоднюю ноч у забаўляльных мерапрыемствах сталіцы бралі ўдзел каля 70 тысяч мінчан і гасцей горада.

Паводле інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, у забеспячэнні асабістай бяспекі грамадзян і ахове грамадскага парадку ў месцах правядзення святочных гулянняў былі задзейнічаны супрацоўнікі органаў унутраных спраў і вайскоўцы войск МУС.

Надзвычайных здарэнняў дапушчана не было, задачы па забеспячэнні грамадскага парадку выкананы. А вось без здарэнняў, звязаных з выкарыстаннем піратэхнікі, на жаль, не абышлося. Літаральна праз паўгадзіны пасля надыходу новага года на вуліцы Усходняй загарэўся аўтамабіль «Таёта». Прычына пажару — неасцярожнае выкарыстанне піратэхнічных вырабаў неўстаноўленай асобай. А яшчэ праз гадзіну сталічныя ратавальнікі-пажарныя ліквідавалі загаранне на балконе трэцяга паверха пяціпавярхоўкі па вуліцы Кальцова. Гаспадароў дома не было. Мяркуецца, што прычынай здарэння стаў або кінуты зверху недакурак, або зноў жа піратэхніка, якая заляцела на балкон. Амаль у чатыры раніцы непадалёку ад «Чыжоўка-Арэна» брыгада «хуткай дапамогі» забрала ў бальніцу 36-гадовага мужчыну, які атрымаў рану кісці правай рукі ад разрыву петарды, аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Паколькі святы яшчэ працягваюцца, ратавальнікі-пажарныя нагадваюць аб неабходнасці захавання правіл бяспекі, у тым ліку пры выкарыстанні піратэхнічных вырабаў. Выходзячы на вуліцу, не пакідайце расчыненымі вокны і балконныя рамы, адключыце электрапрыборы. Калі бачыце, што людзі запускаюць піратэхніку, не падыходзьце бліжэй за 50 метраў да гэтага месца.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Бяспека

ПАКУЛЬ ЛЁД ТОНКІ

Брэсцкі аблвыканкам па ініцыятыве абласнога ўпраўлення МНС прыняў распараджэнне аб забароне выхаду на лёд. Вадаёмы з наступленнем маразоў пакрыліся лёдам, але на поўдні краіны лёд недастаткова трывалы, каб выходзіць на яго, лічаць спецыялісты.

З першых дзён новага года супрацоўнікі Брэсцкага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанне гібелі людзей на вадаёмах. Такія выпадкі, на жаль, былі ў мінулыя гады. Таму ратавальнікі зноў і зноў тлумачаць рыбакам, што на лёд нельга выходзіць, калі ён танчэйшы за сем сантыметраў. Кожнаму аматару падлёднай лоўлі трэба мець выратавальную камізэльку і лінь (вяроўку) даўжынёй 15-20 метраў з пятлёй на адным канцы і грузам каля паўкілаграма на другім. Гэтае прыстасаванне дапаможа, калі чалавек раптам праваліцца ў ваду. Лінь неабходна кінуць у бок берага і старацца выбрацца на трывалы лёд, а затым павольна прасоўвацца ў кірунку берага. Памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў яшчэ раз напомніў пра абавязак кожнага дбаць пра сваю бяспеку.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Замовіць таксі праз дыспетчарскую — танней

У сувязі з тым, што пачасціліся звароты грамадзян па пытаннях неабгрунтавана завышаных кіроўцамі аўтамабіляў-таксі тарыфаў, транспартная інспекцыя Міністэрства транспарту і камунікацый выступіла з тлумачэннем сітуацыі. Так, у выпадку, калі пасажыр не звяртаецца ў дыспетчарскую службу для замовы аўтамабіля-таксі, тарыфы гэтай дыспетчарскай службы на перавозку не распаўсюджваюцца.

Тарыфы на паслугі па перавозцы пасажыраў аўтамабілямі-таксі не ўваходзяць у зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 лютага 2011 года №72 пералік тавараў (работ, паслуг), цэны (тарыфы) на якія рэгулююцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), і зацвярджаюцца самастойна перавозчыкам.

У сувязі з гэтым спецыялісты транспартнай інспекцыі звяртаюць увагу пасажыраў, што, калі пасадка ў аўтамабіль-таксі была праведзена не праз дыспетчарскую службу (шляхам падачы сігналу рукой або са стаянкі), перавозчыкамі можа быць устаноўлены ў шмат разоў завышаны тарыф з уключэннем таксометра і выдачай пасля чэка аб аказанні паслугі па перавозцы.

У адпаведнасці з Правіламі аўтамабільных перавозак пасажыраў, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў ад 30 чэрвеня 2008 года №972, пасажыр аўтамабіля-таксі мае права пры афармленні замовы на паездку ў аўтамабілі-таксі атрымліваць інфармацыю аб прыкладным кошце і ўмовах паслуг, што прадастаўляюцца. Трэба звяртаць увагу і даведвацца да пасадкі аб прыблізным кошце ад пачатковага да канчатковага пункту маршруту. Апроч таго, у адпаведнасці з вышэйназванымі правіламі, кіроўца аўтамабіля-таксі абавязаны па заканчэнні перавозкі, выкананай за наяўны ці безнаяўны разлік, выдаць пасажыру касавы чэк і правесці з ім разлік.

Пасажыр мае права патрабаваць чэк па заканчэнні перавозкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Самая лепшая сярод маладых эканамістаў...

Чацвёртакурсніца факультэта міжнародных адносін БДУ Вікторыя Корнева стала пераможцай першага этапу міжнароднага конкурсу сярод маладых эканамістаў-фінансістаў «Валюта ЕАЭС-2015», вынікі якога былі падведзены ў Маскве.

Яна адзіная з усіх канкурсантаў набрала 18,1 бала з 20 магчымых і была ўдастоена высокіх узнагарод ва ўсіх шасці намінацыях. У рамках спаборніцтва суіскальнікам была прапанавана тэма: «Адзіная валютная прастора: аналіз меркаванняў аб канцэпцыях і інструментах палітычных і бізнес-эліт краін ЕАЭС, БРІКС, ЕС». Вікторыя Корнева прадставіла навуковую працу, у якой, грунтуючыся на вопыце Еўрапейскага саюза, прапанавала карту магчымых рызык увядзення адзінай валюты для ЕАЭС.

Працы студэнтаў ацэньваліся па крытэрыях шасці намінацый. Даследаванне Вікторыі было прызнана «Найлепшай конкурснай працай ЕАЭС», «Самай практычнай конкурснай працай ЕАЭС» і перамагло сярод работ, пададзеных на конкурс беларускімі студэнтамі.

У намінацыях «Самая комплексная і сістэмная конкурсная праца» і «Самая арыгінальная конкурсная праца» дзяўчына размясцілася на другім месцы, а ў барацьбе за «Найлепшую прэзентацыю конкурснай працы» чацвёртакурсніца БДУ стала трэцяй.

Усяго ў першым этапе конкурсу ўдзельнічалі каля 100 студэнтаў і маладых даследчыкаў з Расіі, Беларусі, Казахстана і Кыргызстана. І толькі 26 аўтараў лепшых работ змогуць прадставіць свае эканамічныя распрацоўкі ў другім туры міжнароднага конкурсу «Валюта ЕАЭС-2015», які пройдзе ў пачатку 2016 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Карасі з возера Дзявочага

У Мінскай вобласці дзяржінспектары нядаўна выявілі два выпадкі незаконнай здабычы рыбы ў буйным і асабліва буйным памерах.

Жыхар Салігорска ноччу перавозіў на сваім аўтамабілі 85 кілаграмаў адборнай азёрна-рачной рыбы — 116 асобін розных відаў. На ўлове былі відаць сляды ад сетак. Таксама ў машыне былі мокрая гумавая лодка і вёслы.

У Нясвіжы дзяржінспектары і супрацоўнікі ДАІ пры праверцы «Сітрана», спыненага каля возера Дзявочага, знайшлі ў багажніку тры пластыкавыя ёмістасці з рыбай. У іх было 3 782 асобіны сярэбранага карася агульнай вагой 67 кілаграмаў. Раней уладальніка машыны ўжо прыцягвалі да адказнасці за крадзеж рыбы з сажалкі, а яго жонку — за несанкцыянаваны гандаль рыбай.

Пагражаў дзяржінспектарам зброяй

Каля адселенай вёскі Мокрае Касцюковіцкага раёна супрацоўнікі мясцовай міжрайінспекцыі затрымалі паляўнічага-нелегала, які прыйшоў з расійскага боку.

Заўважыўшы дзяржінспектараў, зламыснік паспрабаваў збегчы. Уцякаючы, парушальнік размахваў зараджанай зброяй і пагражаў стрэліць, калі не спыніцца яго пераследаванне. Каб «суцішыць пыл» дзёрзкага браканьера, інспектар пасля папярэджання сам стрэліў у паветра. Затрыманы быў жыхаром расійскага сяла Гардзееўка, супрацоўнікам лясгаса. Зброя, боепрыпасы, дакументы на права палявання ў парушальніка канфіскаваны, распачаты адміністрацыйны працэс.

Справа з дарагім аўто не «пракаціла»

Тры мужчыны ўзялі ў Маскве аўтамабіль напракат, а потым заявілі аб яго прапажы.

— Прыяцелі вырашылі зарабіць. Скарыстаўшыся тым, што адзін з іх з'яўляецца грамадзянінам Расійскай Федэрацыі, зламыснікі накіраваліся ў Маскву і ўзялі напракат аўтамабіль «БМВ 525» 2015-га года выпуску, які і афармілі на расіяніна, — расказала прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра Папова.

На гэтым аўто мужчыны вярнуліся ў Мінск. Праз некаторы час адзін з іх, на каго быў афармлены пракат, заявіў у міліцыю аб прапажы транспартнага сродку. Як сам патлумачыў, пакінуў напярэдадні ўвечары машыну каля свайго дома, а яна знікла. Аўтамабіль аператыўнікі знайшлі ў тэхнічна спраўным стане ў... Полацку ў гаражы, які належыць аднаму з прыяцеляў нібыта пацярпелага.

У дачыненні да трох затрыманых грамадзян заведзена крымінальная справа за махлярства, якая прадугледжвае адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да дзесяці гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАЛА № 9. «БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ: 1944—1950 гг. Памяць аб вайне»

Працягваем віртуальнае падарожжа па Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Пра аднаўленне народнай гаспадаркі БССР, разбуранай падчас Вялікай Айчыннай вайны, у старым музеі можна было пачуць фрагментарна. Цяпер жа ёсць асобная экспазіцыя, якая распавядае пра гераізм людзей, што адраджалі краіну.
Гэта быў беспрэцэдэнтны подзвіг савецкага народа ў мірны час. Яшчэ непадалёк грымелі баі, а ў першых вызваленых раёнах нашай краіны пачало наладжвацца новае жыццё. Паўставалі з руін гарады, узніманася з папялішчаў цэлыя вёскі. Вярталіся з эвакуацыі заводы і фабрыкі, будаваліся новыя прадпрыемствы. Дзеці пайшлі ў першыя пасляваенныя школы, запрацавалі крамы, дамы культуры, бібліятэкі... І ўсё дзякуючы людзям, якія як мага хутчэй імкнуліся вярнуцца да ранейшага жыцця — мірнага і незалежнага.

Прыкладна так выглядалі першыя пасляваенныя гарадскія кватэры.

На падлозе — план сталіцы ў 1946 годзе.

Кожную нядзелю жыхары сталіцы працавалі па добраўпарадкаванні горада.

Такія запалкі выраблялі на барысаўскай фабрыцы імя Кірава.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Рэчы, без якіх цяжка было ўявіць сельскі побыт.

МІНСК АДРАДЖАЕЦЦА...

Некаторыя гарады выраслі наноў. Так было і з Мінскам. Мала хто ведае, што разбураную на 80% сталіцу хацелі перанесці за 10 кіламетраў ад гістарычнага месца. Здавалася, аднавіць горад немагчыма. На аэрафотаздымках, зробленых 3 ліпеня 1944 года, уцалелыя будынкі можна пералічыць па пальцах: Дом урада, кафедральны сабор, Акадэмія навук... Фотапанарама горада, змешчаная ўверсе, дазваляе зірнуць на Мінск з птушынага палёту. Унікальныя кадры музею перадаў Дзяржынскі архіў кінафотафонадакументаў.

Да вайны ў сталіцы пражывала каля 270 тысяч чалавек. На момант вызвалення ў ёй засталося 45—50 тысяч жыхароў (па іншых звестках — да 80 тысяч). Мінчане — ад малога да вялікага — выйшлі на гарадскія вуліцы і пачалі расчышчаць іх ад завалаў, руін і смецця.

Неўзабаве разавыя акцыі ператварыліся ў рэгулярныя мерапрыемствы. Першы нядзельнік па аднаўленні горада адбыўся 3 кастрычніка 1944 года. Адзін з іх адлюстраваў беларускі мастак Монас Манасзон. Яркія фарбы характарызуюць уздым, добры настрой, з якім мужчыны і жанчыны, рабочыя і інтэлігенцыя, моладзь і старыя працуюць па аднаўленні горада. Дзесьці на гарызонце рухаецца трамвай: у 1947 годзе, калі была напісана карціна, гэты транспарт ужо курсіраваў па мінскіх вуліцах, а ўсе трамвайныя маршруты былі адноўлены ў кастрычніку 1949-га. Дзевяць вагонаў і кабель адправілі ў беларускую сталіцу ленінградцы.

НА ГЕНПЛАНЕ — СТАЛІЦА

У экспазіцыі — асабістая кніжка ўдзельніка аднаўлення Мінска. Такая была ў многіх жыхароў горада. Кожны працаздольны грамадзянін павінен быў прысвяціць разбору завалаў і руін не менш за 15 гадзін на месяц. Беларусы працавалі без выхадных: з 1940 па 1955 год у СССР існавала шасцідзённая працоўная нядзеля. Сёмы дзень, нядзелю, яны прысвячалі добраўпарадкаванню горада. Людзі, якія перажылі вайну, імкнуліся найхутчэй адбудаваць родны горад.

Былі спраектаваны новыя вуліцы, менавіта ў пасляваенны час заклалі і праспект Незалежнасці. Праз месяц пасля вызвалення ў Мінск прыбыла камісія па справах архітэктуры пры Савеце народных камісараў СССР, якая распрацавала «Эскіз планіроўкі Мінска». Распрацоўкай генеральнага плана займаліся супрацоўнікі «Белдзяржпраекта». Генеральны план сталіцы, канчаткова зацверджаны ў сярэдзіне 1946 года, з дапамогай спецыяльнай заліўкі ўзноўлены на падлозе залы.

СТАНАЎЛЕННЕ ПРАМЫСЛОВЫХ ГІГАНТАЎ

Першымі, хто прыйшоў на дапамогу мінчанам, былі ваенныя будаўнікі. У музеі захоўваецца ўнікальны альбом з фотаздымкамі, графікамі і схемамі па выніках зробленай працы, які на 7 лістапада 1944 года старшыні Савета Народных Камісараў БССР Панцеляймону Панамарэнку падарылі ваенныя дарожнікі. Усяго за чатыры месяцы яны аднавілі сем мастоў праз найбуйнейшыя рэкі краіны, у тым ліку мост праз Свіслач у Мінску.

Ужо ў 1944 годзе ў сталіцы аднавіла сваю працу скургалантарэйная фабрыка імя Куйбышава, запрацавалі цагельны завод №1, аўтарамонтны завод і іншыя прадпрыемствы. Пра першыя поспехі расказваюць фотаздымкі з адноўленых цэхаў кандытарскай фабрыкі «Камунарка», радыёзавода імя Молатава, віцебскай фабрыкі «КІМ». У экспазіцыі — запалкі, выраблены на барысаўскай фабрыцы імя Кірава.

Менавіта ў першыя пасляваенныя гады былі закладзены флагманы беларускай эканомікі — Мінскі аўтамабільны і Мінскі трактарны заводы. Мадэлі дэбютнай прадукцыі — аўтамабіля «МАЗ-205» і трактара «МТЗ-2» — прадстаўлены ў маштабе 1:10. Дарэчы, трактарны завод будаваўся на месцы былога авіяцыйнага завода. Таму і аднаўлялі яго перш як авіяцыйны. Да чэрвеня 1945 года тут ажыццяўлялася зборка савецкіх знішчальнікаў «Як-9». Будаваць два прамысловыя гіганты пачалі беларускія партызаны і моладзь, мабілізаваная з усіх абласцей рэспублікі.

Дзякуючы працоўнаму гераізму нашага народа, а таксама прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў СССР, ужо ў 1945 годзе была адноўлена пятая частка прамысловасці рэспублікі. А ў наступныя пяць гадоў аб'ём прамысловай вытворчасці перасягнуў даваенны на 15%.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ І ГРАШОВАЯ РЭФОРМА

У сельскай гаспадарцы ўсё было значна цяжэй. Даваеннага ўзроўню яна дасягнула толькі ў сярэдзіне 1950-х гадоў.

Нягледзячы на тое, што за гады вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара, а многія працаздольныя мужчыны былі яшчэ на фронце, наша краіна павінна была выконваць план на пастаўку збожжа і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Абавязковым падаткам абкладаліся аднаасобныя гаспадаркі, якія да 1949 года захаваліся ў Заходняй Беларусі. Затым было прынята рашэнне аб масавай калектывізацыі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі з'явіліся новыя вобласці: Гродзенская і Полацкая. Вілейская была перайменавана ў Маладзечанскую.

Да 1947 года ў краіне існавала картачная сістэма. Пяцідзённы талон на харчовыя тавары прадугледжваў 1,5 кілаграма хлеба, 100 грамаў круп, 80 грамаў мяса, па 30 — цукру і тлушчаў. 13 снежня 1947 года картачную сістэму адмянілі. А на наступны дзень была праведзена грашовая рэформа: з'явіліся новыя грошы. Паслярэформенныя грашовыя знакі розных наміналаў прадстаўлены ў адной з вітрын.

СУКЕНКА З ПАРАШУТА І БОЦІКІ-ГАЛЁШЫ

Калі ў гарадах, перш за ўсё ў сталіцы, жыллё ўзводзілася сіламі прафесійных будаўнікоў, то жыллёвы фонд у вёсках аднаўляўся ў асноўным самім насельніцтвам — метадам талакі. Карціну сапраўднага жыцця беларусаў пасля вызвалення ярка характарызуе зводка «Аб ходзе будаўніцтва жылых дамоў, усялення ў іх сямей, пражываючых у зямлянках і лесавывазцы» на 1 ліпеня 1946 года. Ужо два гады Беларусь знаходзілася не пад акупацыяй, а больш за 60 тысяч сем'яў працягвала жыць у зямлянках.

У экспазіцыі — цэгла, якая ў 1945 годзе была выкарыстана пры закладцы печы ў хаце жыхара вёскі Млёхава Барысаўскага раёна Сцяпана Канашэвіча. Заводскія клеймы сведчаць, што вырабілі яе ў Зембіне, Барысаве і Студзёнцы. Невялікія заводы будавалі там, дзе знаходзілі паклады гліны. Такім чынам, ледзь не ў кожным кутку краіны былі свае цагельні.

Прадметы сельскага побыту — маслабойка, чарпак, бочачка, цэп для малацьбы, піла смычковая, кашуля і сукенка, пашытыя з парашутнага шоўку, — трапілі ў музей таксама з сям'і Канашэвічаў. Кашулю насіў сын гаспадара Пётр, які сам яе і пашыў. Пасля вызвалення Беларусі юнак пайшоў на фронт, загінуў у Польшчы. А вось у гаспадыні сукенкі, яго сястры Еўдакіі, лёс быў шчаслівейшы: менавіта ў ёй дзяўчына выходзіла замуж.

Туфлі, пальчаткі, сумачкі, муфта, чаравікі фабрыкі «Прамень» — рэчы, якія можна было адшукаць у гардэробе гараджанак. У боціках з полымі абцасамі дзяўчаты, хутчэй за ўсё, хадзілі ў тэатр. Боцікі зроблены па прынцыпе галёшаў: іх абувалі наверх на абутак. Пусты ўсярэдзіне абцас дазваляў абуваць іх нават на «шпількі».

Такім уяўляў будынак музея гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі архітэктар Аляксандр Воінаў.

Славуты агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну» ў жніўні 1945 года перайменавалі ў часопіс сатыры і гумару «Вожык».

ПЕРШЫЯ ВУЧНІ І ЛЁС СІРОТ

Асаблівую ўвагу кіраўніцтва дзяржавы надавала аднаўленню навукі і адукацыі. Настаўнікаў катастрафічна не хапала. Як пацверджанне — дакумент на імя настаўніцы Валянціны Башковай за подпісам камісара народнай адукацыі Еўдакіі Уралавай, які прадпісвае тэрмінова вярнуцца з эвакуацыі на месца сваёй працы. Чыгуначны білет настаўніцы, што датуецца вераснем 1944 года, і пропуск, які дазваляў ёй праехаць па арэнбургскай чыгунцы да Беларусі, захоўваюцца ў музеі.

Ужо ў 1944/1945 навучальным годзе агульнаадукацыйнымі школамі былі ахоплены 1 200 навучэнцаў. У экспазіцыі — званок, які на першы пасляваенны ўрок клікаў вучняў Млёхаўскай сярэдняй школы, што на Барысаўшчыне. Як былі абуты навучэнцы, можна ўбачыць на групавым фотаздымку: хто ў чаравіках, хто ў лапцях, а некаторыя і басанож. Але ў той час на гэта мала хто звяртаў увагі. Дзеці прагнулі ведаў. Можна толькі ўявіць, з якім імпэтам яны гарталі старонкі з творамі Пушкіна, Лермантава, Куляшова...

Вайна зрабіла сіротамі 138 тысяч беларускіх дзяцей. Клопат аб іх узяла на сябе дзяржава. Праблему вырашылі дзіцячыя дамы. У 1950 годзе іх налічвалася 300 па рэспубліцы. На фотаздымку — выхаванкі Чэрвеньскага дзіцячага дома Алена Лях, Клаўдзія Кастаненка і Тамара Галалоб. Пуцёўка і ўліковая картка, з якімі прымалі ў дзіцячыя дамы, належалі Алене Лях. Яе бацька ўсяго некалькі метраў не дабег да лесу, калі гітлераўцы спрабавалі акружыць вёску. Маці памерла ў хуткім часе пасля вызвалення.

Востра стаяла дэмаграфічная праблема. Каб палепшыць сітуацыю, 8 ліпеня 1944 года быў выданы Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, які ўстанавіў цэлую сістэму новых узнагарод — ордэнаў і медалёў — у падтрымку маці, якія нарадзілі і выхавалі пяцёра і болей дзяцей. У экспазіцыі — «Медаль мацярынства» 2-й ступені, узнагарода жыхаркі вёскі Дукора Пухавіцкага раёна, партызанкі Фаціннi Гулы, якая выхоўвала шасцярых дзяцей.

УКЛАД У НАВУКУ

Хуткімі тэмпамі аднаўлялася сетка вышэйшых, а таксама сярэдніх навучальных устаноў. У 1950 годзе функцыянавала ўжо 29 устаноў (перад вайной іх налічвалася 24). Наладжвалася праца і ў навуковай сферы.

Дакументы, змешчаныя ў экспазіцыі, належалі члену Акадэміі навук БССР Маркелу Макушку. Украінец па нацыянальнасці, прафесар удзельнічаў у аднаўленні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1946 года ўзначальваў інстытут біялогіі пры БДУ, а з 1949 года загадваў кафедрай дарвінізму і генетыкі ўніверсітэта. Займаючыся даследаваннем іхтыяфаўны рэк і азёр Беларусі, вучоны ўнёс вялікі ўклад у аднаўленне рыбнай гаспадаркі. І цяпер студэнты біяфака займаюцца ў навуковай лабараторыі на возеры Нарач, у стварэнні якой прымаў удзел і Макушок.

ААН І ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ

Уклад беларускага народа ў перамогу над Германіяй адкрыў для нашай краіны выхад на міжнародную арэну. 27 красавіка 1945 года Міжнародная канферэнцыя ў Сан-Францыска адзінагалосна прыняла рашэнне аб уключэнні Украінскай і Беларускай ССР у лік першапачатковых членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. А ўжо 26 чэрвеня ўпаўнаважаныя 50 краін-заснавальніц, у тым ліку старшыня беларускай дэлегацыі Кузьма Кісялёў, падпісалі Статут ААН. Брашуру «Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый», партсігар, якія належалі тагачаснаму міністру замежных спраў БССР, не так даўно ў музей перадаў сын Кісялёва. На канферэнцыі прысутнічаў і пісьменнік Міхась Лынькоў. Пропуск, пасведчанне і значок дэлегата захоўваюцца ў музеі.

У якасці члена ААН у жніўні 1945-га Беларусь была прынята ў ЮНРРА — Адміністрацыю дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый. Гэта давала права нашай краіне разлічваць на дапамогу міжнароднай супольнасці ў адраджэнні разбуранай вайной гаспадаркі. У выніку беларускія сем'і, якія найбольш мелі патрэбу, атрымлівалі пасылкі з харчаваннем, вопраткай і абуткам. Пра тое, што дапамога сапраўды аказвалася, сведчаць медыкаменты, лямпачка (дарэчы, яшчэ не перагарэла!), упакоўкі ад харчовага пайка і сэканд-хэнду.

У межах міжнародных пагадненняў, якія ў лютым 1945-га былі дасягнуты на Ялцінскай канферэнцыі, вярталіся на радзіму савецкія ваеннапалонныя і грамадзяне, вывезеныя на прымусовыя работы ў Германію. Сям'я Коласавых, напрыклад, трапіла ў горад Шмалькальдэн, што ў Цюрынгіі, за дзень да вызвалення роднага Лунінца. Дамоў вярнуліся, на шчасце, усім складам: муж, жонка і двое дзяцей. Берэт, кофту і бітончык падлеткі прывезлі з сабой.

СУД НАД АКУПАНТАМІ

За свае злачынствы гітлераўцы былі пакараны. Судовыя працэсы адбыліся і ў Віцебску, Бабруйску і Мінску. Адзін з самых вядомых, які цягнуўся з 15 па 29 студзеня 1946 года, прайшоў у Акруговым доме афіцэраў. Узнавіць тыя падзеі дапамаглі беларускія кінадакументалісты, якія стварылі фільм «Суд гісторыі». Яго, як і іншыя кінастужкі, можна паглядзець на адным з маніторaў залы.

Найбольш жорсткія злачынцы панеслі смяротнае пакаранне. Астатнія былі адпраўлены на прымусовыя работы, у асноўным на будоўлі. Так нямецкія ваеннапалонныя ўнеслі сваю лепту ў адраджэнне нашай краіны. Керамічныя кубкі, якімі тыя карысталіся пры будаўніцтве аб'ектаў у Магілёве, і партсігар, прывезены з Барысава, — у экспазіцыі.

ПАСЛЯВАЕННАЯ КВАТЭРА

Акунуцца ў атмасферу пасляваеннага часу дазваляе інсталяцыя «Гарадская кватэра». У інтэр'еры — прадметы побыту, якімі карысталіся жыхары першых пабудаваных кватэр. Перадаючы ў музей сямейныя рэліквіі, ваеннае пакаленне напаўняла гэтыя сцены цікавымі гісторыямі. Напрыклад, швейную машынку музею падарыла Вольга Манковіч, дачка камісара партызанскай брыгады «Жалязняк». Гэтую патрэбную ў хатняй гаспадаркі рэч сям'я набыла яшчэ да вайны. У гады Вялікай Айчыннай гаспадыня, Ефрасіння Мікітаўна, з яе дапамогай абшывала не толькі сваіх дамачадцаў, а і партызанаў брыгады. Спатрэбілася машынка і ў пасляваенны час.

Крэсла — трафейнае. Перш, чым трапіць у музей, яно выкарыстоўвалася па прызначэнні ў адным з ваенных вучылішчаў Мінска. Часцяком крэсламі і нават ложкамі для дзяцей служылі чамаданы. Венскі столік разам са сваімі гаспадарамі, сям'ёй Бязродновых, вярнуўся ў Мінск з эвакуацыі. Чайнікам карысталася сям'я вядомага беларускага літаратара Аляксея Зарыцкага. Гадзіннік-ходзікі — папулярны прадмет тагачаснага інтэр'еру — у музей перадала сям'я Лісоўскіх з Чашніцкага раёна. А цацачны мішка належаў Юрыю Гігіняку, супрацоўніку Нацыянальнай акадэміі навук. Вучонаму няпроста было расставацца з сябрам дзяцінства: у далёкім 1945-м гэтага мядзведзіка падарыў яму бацька-франтавік. З серыі дзіцячых забаў — і аўтамат ППШ. Вядома ж, цацачны! Такі падарунак свайму сыну Анатолю Ганчарову таксама зрабіў бацька, які вярнуўся з вайны.

ПРЭМІЯ... БУЛЬБАЙ

Рашэнне аб стварэнні музея гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі было прынята 30 верасня 1943 года. Ішла вайна, а ўжо пачалі з'яўляцца першыя экспанаты. За вельмі кароткі тэрмін — менш чым за год! — было сабрана каля 10 тысяч прадметаў. 22 кастрычніка 1944 года ў адным з некранутых вайной будынкаў — у Доме прафсаюзаў на плошчы Свабоды — адчыніў свае дзверы першы ў свеце музей, прысвечаны падзеям Другой сусветнай вайны.

Гэты будынак існуе і сёння. На фотаздымку добра відаць трамвайная лінія, якая ў той час праходзіла праз плошчу; побач з уваходам прыпаркаваны аўтамабіль — кажуць, ён належаў першаму дырэктару музея Васілю Стальнову. Толькі мала хто ведае, што першапачаткова музей мог выглядаць па-іншаму. На будынак, дзе планавалася захоўваць спадчыну Другой сусветнай, быў аб'яўлены конкурс. Па задуме архітэктара Аляксандра Воінава, музей павінен быў размясціцца якраз на тым месцы, дзе знаходзіцца Палац Рэспублікі. Але з невядомых прычын адна з цэнтральных плошчаў сталіцы не была ўпрыгожана велічным будынкам, а дачакалася новых часоў.

Музей адкрыўся адразу дзвюма выставамі. Наведвальнікам былі прадэманстраваны ўзбраенне беларускіх партызанаў і бальшавіцкі друк Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя карысталася поспехам, і ў гэтым была заслуга супрацоўнікаў, якія літаральна жылі пры музеі. Усім тым, хто вызначыўся ў работах па стварэнні выстаў, кіраўніцтвам дзяржавы было загадана выдаць прэмію бульбай з падсобнай гаспадаркі. Першая прэмія складала 80 кілаграмаў караняплодаў, другая — 50, трэцяя і чацвёртая — па 30 кілаграмаў.

* * *

Нягледзячы на шматлікія цяжкасці, беларускі народ за кароткі перыяд здолеў аднавіць народную гаспадарку рэспублікі. Дзеля цывілізаванага жыцця і будучыні сваіх нашчадкаў, савецкія людзі з'ядналіся, як тады, у 1941-м. І зноў перамаглі! Перамаглі на полі працоўным. Бо каб не яны (як гэта не банальна), не было б і нас, а адпаведна, і наступнай залы — «Нашчадкі Вялікай Перамогі», пра якую пасля.

А пакуль, паважаныя чытачы, у вас ёсць магчымасць зрабіць свой унёсак у папаўненне музейных калекцый. Раптам сярод вашых рэчаў або ў родных ці знаёмых знойдуцца прадметы, якімі карысталіся ў 1944—1953 гадах? Было б добра, каб адгукнуліся і старажылы МАЗа і МТЗ. Магчыма, сярод усяго таго, што вы захоўваеце як напамін аб працы, ёсць нешта цікавае і арыгінальнае. Калі так, то вашаму рарытэту абавязкова знойдзецца месца ў новым музеі.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ, загадчыца аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Дарэчы, за значны ўклад у развіццё музейнай справы і патрыятычнае выхаванне насельніцтва калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Віншуем!

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

Организатор аукциона –

Белорусское республиканское унитарное страховое предприятие «Белгосстрах» в лице филиала Белгосстраха по Брестской области,

расположенного по адресу: г. Брест, ул. Московская, 273А

НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

ЛОТ № 1 – нежилое изолированное помещение на первом этаже административного здания площадью 10,0 кв. м, расположено по адресу: г. Брест, ул. Московская, 273А. Помещение обеспечено инженерными коммуникациями.

ЛОТ № 2 – нежилое изолированное помещение на первом этаже административного здания площадью 10,1 кв. м, расположено по адресу: г. Брест, ул. Московская, 273А. Помещение обеспечено инженерными коммуникациями.

Срок аренды – 3 года начиная с даты заключения договора аренды.
Размер коэффициента в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду по предлагаемым помещениям составляет 3,0.
Начальная цена продажи права аренды по лоту № 1 составляет 300000 руб., размер задатка по лоту – 30000 руб.
Начальная цена продажи права аренды по лоту № 2 составляет 303000 руб., размер задатка по лоту – 30300 руб.

Аукцион состоится 8 февраля 2016 года
по адресу: 224023, г. Брест, ул. Московская, 273А в актовом зале (к. № 313) в 14.00.
Заявления и документы на участие в аукционе принимаются с 1 февраля 2016 года по 5 февраля 2016 года с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224023, г. Брест, ул. Московская, 273А, к. № 402.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238».

(в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 12.07.2013 № 607) (далее – положение)

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на р/с филиала Белгосстраха по Брестской области № 3011441154016 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, МФО 153001739, УНП 100122726, ОКПО 00036788;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность, подтверждающую полномочия должностного лица, и документ, удостоверяющий личность данного предъявителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Результаты аукциона аннулируются по решению организатора аукциона в случаях, если победитель аукциона в установленный срок:

- не подписал протокол о результатах аукциона;
- не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона;
- не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона;
- не подписал договор аренды.

Внесенный им задаток в этом случае не возвращается и перечисляется в доход соответствующего бюджета в течение 3 (трех) рабочих дней со дня аннулирования результатов аукциона.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в случаях, предусмотренных п.14 положения, составляет 3 базовые величины.

Телефоны для справок: (8-0162) 41-36-37, 41-08-36, 40-53-44, факс 41-49-23.

■ Працяг тэмы

З НАДЗЕЯЙ НА АДКРЫЦЦЁ

Ці знойдуцца сродкі для музея Алеся Адамовіча?

Сёлета ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна павінен быў адкрыцца музей вядомага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча, па кнізе якога «Хатынская аповесць» пастаўлены пранізлівы да дрыжыкаў фільм пра вайну «Ідзі і глядзі». Падчас кінасеансаў апошняга за мяжой каля кінатэатраў дзяжурылі «хуткія дапамогі», каб ратаваць занадта ўражлівых гледачоў. Пасля прагляду кінаповесці пажылы нямецкі салдат, былы афіцэр вермахта, прызнаўся: «Я сведчу: усё расказанае ў гэтым фільме — праўда. І самае страшнае і ганебнае для мяне, што гэты фільм убачаць мае дзеці і ўнукі».

У канцы мінулага года «Звязда» (нумар ад 28 кастрычніка) звярнулася да балючай тэмы адкрыцця ў Глушы музея аўтара гэтага аднаго з самых жорсткіх па рэалістычнасці твораў пра вайну. У якасці падыходзячага памяшкання разглядаўся будынак былой аптэкі, дзе падчас вайны адбываліся падзеі яшчэ аднаго твора Алеся Адамовіча — «Вайна пад стрэхамі». У канцы 90-х мінулага стагоддзя будынак быў перададзены на баланс аддзела культуры Бабруйскага райвыканкама, але музеем за гэты час так і не стаў.

Тры гады таму спроба спонсараў зрабіць праектна-каштарысную дакументацыю застопарылася на тэхнічнай экспертызе. Жыхары Глушы, занепакоеныя тым, што рэканструкцыя адкладваецца, звярнуліся ў Магілёўскі аблвыканкам. Пэўны час іх зварот знаходзіўся на кантролі. Па некаторых звестках, нават былі выдзелены бюджэтныя сродкі, якія маглі выправіць становішча, але чамусьці па прызначэнні яны не дайшлі. У выніку сітуацыя зайшла ў тупік.

Бабруйскі райвыканкам чакае, калі спонсары пачнуць рэканструкцыю будынка. Спонсары, у сваю чаргу, не рызыкуюць укладваць грошы ў аб'ект, пакуль няма афіцыйнага рашэння райвыканкама аб стварэнні музея. Маўляў, балансатрымальнік можа перадумаць і пасля рамонту адкрыць там замест музея краму або яшчэ што-небудзь, дзе пакіне, калі пажадае, куток «для Адамовіча».

У кастрычніку на сустрэчы з жыхарамі пасёлка Глуша намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкама Святлана Носава агучыла афіцыйны адказ Магілёўскага аблвыканкама наконт таго, што грошай на рэканструкцыю будынка ў дзяржавы няма, а спонсары страцілі цікавасць. Пры гэтым яна паведаміла, што надаваць статус музея будынку райвыканкам не плануе. Як і адкрываць разліковы рахунак на збор сродкаў на яго рэканструкцыю. Адказ не задаволіў насельніцтва, і пытанне засталося адкрытым. Дык будзе музей у Глушы ці не?

Рэдакцыя атрымала афіцыйныя адказы Бабруйскага райвыканкама і Магілёўскага аблвыканкама, дзе гаворыцца, што артыкул разгледжаны на аператыўнай нарадзе Бабруйскага райвыканкама з удзелам усіх зацікаўленых асоб. Там таксама паведамляецца, што Бабруйскі райвыканкам звярнуўся ў камітэт па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама з прапановай уключыць вышэйназваны аб'ект у інвестыцыйную праграму на 2016 год.

На імя дачкі пісьменніка Наталлі Адамовіч накіраваны пісьмовы запыт наконт магчымасці сустрэчы са спонсарамі, згоднымі фінансаваць рэканструкцыю будынка. «Пытанне аб пачатку рэканструкцыі музея будзе разгледжана пасля вызначэння крыніц фінансавання», — гаворыцца ў лістах з райі аблвыканкамаў.

Па больш дакладную інфармацыю пра будучыню музея карэспандэнт «Звязды» звярнулася да старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміра Дамашэўскага.

— Гэта пытанне стаіць на парадку дня, — паведаміў ён. — Ёсць людзі, не абыякавыя да гэтай праблемы і гатовыя яе фінансаваць. Спонсарскія грошы будуць выкарыстаны мэтанакіравана. Для гэтага мы гатовы скласці адпаведны дагавор, прапісаць неабходныя пункты і вызначыць умовы. Калі ў спонсараў ёсць нейкія сумненні, я гатовы на сваім узроўні ўрэгуляваць пытанне.

Адным з неабыякавых да справы людзей з'яўляецца пісьменнік і дзяржаўны дзеяч Расіі Валерый Казакоў. Падчас апошняга свайго візіту ў Магілёў ён запэўніў, што прыкладзе максімум намаганняў, каб музей у Глушы адкрыўся.

— Гэты музей абавязкова павінен з'явіцца, таму што быў такі чалавек, — падкрэсліў Казакоў. — Алесь Адамовіч напісаў «Вайну пад стрэхамі» і шмат іншага, дзе расказаў пра мужных людзей, пра партызанаў. Пра тое, што ён сам бачыў і перажыў. І была ў Глушы аптэка — явачны пункт, куды прыходзілі партызаны і падпольшчыкі. Было вялікае супраціўленне нашага народа страшнаму, разумнаму, падступнаму і моцнаму ворагу. Адамовічу можна паставіць помнік ужо толькі за тое, што ён разам з Элемам Клімавым зрабіў фільм «Ідзі і глядзі». Чаму да класікаў беларускай літаратуры такое стаўленне? Мы не маем права іх забываць.

«Звязда» збіраецца і далей адсочваць падзеі вакол стварэння музея класіка беларускай літаратуры ў Глушы. На жаль, спробы ўключыць аб'ект у інвестыцыйную праграму на 2016 год не мелі поспеху.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

АТРЫМАЦЬ ДЫПЛОМ, НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ДОМУ

БДУІР і ЮНЕСКА будуць разам навучаць людзей з абмежаванымі магчымасцямі дыстанцыйна.
Ва ўніверсітэце адкрываецца кафедра сусветнай арганізацыі «Прафесійная адукацыя ў сферы інфакамунікацыйных тэхналогій асоб з асаблівымі патрэбамі».

— Мы цяпер працуем над прапановай па навучанні асоб з абмежаванымі магчымасцямі тэхнічнай творчасці і вынаходніцтву, — расказвае **загадчык кафедры ЮНЕСКА Валерый НАЗАРАНКА**, — а таксама падалі дзве заяўкі ў Міністэрства адукацыі на выкананне навукова-даследчых работ на кафедры ў галіне адукацыі і сацыяльнай рэабілітацыі людзей з асаблівымі патрэбамі.

Падрыхтоўка людзей з абмежаванымі магчымасцямі па дыстанцыйнай форме навучання вядзецца ў БДУІР ужо на працягу 15 гадоў. На дадзены момант каля 80 «асаблівых» студэнтаў атрымліваюць вышэйшую адукацыю, не выходзячы з дому.

— Калі я прымаў рашэнне аб атрыманні вышэйшай адукацыі, дыстанцыйная форма навучання была толькі ў БДУІР, іншых варыянтаў не існавала. Але я ні разу не пашкадаваў аб гэтым і рады, што магу асвойваць новую сучасную спецыяльнасць. Мяркую, што з адкрыццём кафедры ЮНЕСКА ў нашым універсітэце ў людзей з абмежаваннямі з'явіцца больш магчымасцей, каб расці прафесійна, — кажа студэнт 6 курса бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання БДУІР Яўген Салянаў.

Першыя крокі насустрач людзям з асаблівымі патрэбамі ўжо зроблены. Далей — абмен вопытам з краінамі-суседкамі. Днямі ў БДУІР прайшла І Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Бесперапынная прафесійная адукацыя асоб з абмежаванымі магчымасцямі», якая сабрала каля 60 прадстаўнікоў з Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана.

ТРЫУМФ ЛЕПШЫХ

Алфёраўскі фонд вызначыў свайго фаварыта

Нацыянальная акадэмія навук і Алфёраўскі фонд назвалі пераможцу конкурсу сярод маладых навукоўцаў.

Прэмія ў галіне біялогіі, хіміі, медыцыны, аграрных навук і навук аб Зямлі прысуджана загадчыку лабараторыі Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдату хімічных навук, старшыні Савета маладых навукоўцаў акадэміі Андрэю ІВАНЦУ.

Малады вучоны атрымаў пры тайным галасаванні камісіі абсалютную большасць галасоў за сваю працу «Атрыманне і ўласцівасці сарбцыйна-каталітычных і мембранных матэрыялаў для ачысткі вады». Прэмія будзе ўручана яму ад імя заснавальнікаў напярэдадні Дня беларускай навукі. Пераможца атрымае суму ў беларускіх рублях, эквівалентную 2,5 тысячы долараў.

Сёлета конкурс праводзіўся другі раз. Для ўдзелу ў ім былі вылучаны шэсць кандыдатур маладых навукоўцаў, працы якіх атрымалі прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Інфармацыя аб вылучэнні кандыдатаў не рабілася здабыткам грамадскасці. Намінатары (а гэта вядучыя вучоныя краіны ў пэўнай галіне) не ставілі ў вядомасць намінантаў аб іх вылучэнні на суісканне прэміі. Прычым гэтая канфідэнцыяльнасць захоўвалася на ўсіх этапах конкурсу аж да прыняцця рашэння.

Згодна з палажэннем конкурсу, удзельнічаць у ім можа адзін аўтар або група аўтараў у складзе не больш як трох чалавек. Навуковая адзнака работ робіцца камісіяй па прэміях НАН Беларусі. У яе склад уключаны аўтарытэтныя навукоўцы.

Прэмія НАН Беларусі і Алфёраўскага фонду за навуковыя працы і вынаходкі, якія маюць важнае значэнне для фундаментальнай і прыкладной навукі, была заснавана ў чэрвені 2014 года ў мэтах заахвочвання маладых (да 35 гадоў) беларускіх вучоных. Гэтая ініцыятыва належыць нобелеўскаму лаўрэату, віцэ-прэзідэнту Расійскай акадэміі навук, замежнаму члену НАН Беларусі, акадэміку РАН Жарэсу Алфёраву.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев» на вторых повторных торгах

1	**Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и элек. почта**	Председатель ликвидационной комиссии Мищук А.М. ОАО «Барановичидрев», Брестская обл., г. Барановичи, п. Восточный, 3 тел. 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; mischuk_am@mail.ru
2	**Форма проведения вторых повторных торгов. Дата, время и место проведения торгов**	Вторые повторные торги в форме аукциона (далее по тексту – торги или аукцион). **22 января 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, административное здание, актовый зал**
